АД ПЕРШАЙ АСОБЫ
АХОЎНІКАМ МЯЖЫ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА 2 стар.
УЗНАГАРОДЫ
ШАНУЕМ ТАЛЕНТЫ! 2 стар.
СІТУАЦЫЯ
ПРЫЙШЛІ ХАЛАДЫ — МЕДЫКІ ЗАНЕПАКОЕНЫ 2 стар.

АСОБА
КАСМІЧНАЯ АДЫСЕЯ ІВАНА МІСКО 4 стар.
ДА 120-годдзя ЯНКІ КУПАЛЫ
МУЗЕЙ ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ 5 стар.
ПРЭЗЕНТАЦЫЯ
НОНКАНФАРМІЗМ МІКОЛЫ РАВЕНСКАГА 6—7 стар.

СПАДЧЫНА
МАЛЯВАНЫ ДЫВАН — РАСКВЕЧАНЫ КВАДРАТ МАЛЕВІЧА 7 стар.
ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫТАНКА
КАЗКА СТАНІСЛАВА ВАЛОДЗЬКІ ПРА ТОЕ, ЯК ЗВЯРЫ КАЛЯДАВАЛІ 8 стар.
КРЫЖАВАНКА АД ІРЫНЫ БЕКІШ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

16 студзеня 2002 года, № 3 (2769) Цана 120 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

HALLO, АМЕРЫКА!

У Мінску адбылася афіцыйная цырымонія провадаў беларускіх спартсменаў на XIX зімовыя Алімпійскія гульні, якія хутка пачнуцца ў амерыканскім Солт-Лейк-Сіці.

Фота БелТА.

У складзе нацыянальнай каманды — 77 лепшых майстроў спорту, якія будуць прадстаўляць нашу краіну ў такіх відах, як біятлон, фрыстайл, фігурнае катанне, скарасны бег на каньках, лыжныя гонкі, і іншых.

Як адзначыў капітан зборнай Алег Рыжанкоў, у Злучаных Штатах Амерыкі алімпійцы спадзяюцца адкрыць лік беларускім медалям у трэцім тысячагоддзі. Хацелася б верыць, што так яно і будзе і нашы суайчыннікі выступяць лепш, чым у Нагана, дзе яны занялі 20-е месца ў камандным заліку і заваявалі два бронзавыя медалі. Дарэчы, упершыню беларус — коннік з Гродна — удзельнічаў у Алімпійскіх гульнях 1912 года, якія праходзілі ў Стакгольме.

СНЕГАПАД, СНЕГАПАД...

Надвор'е на тэрыторыі Беларусі па-ранейшаму застаецца непрадказальным: жорсткія маразы чаргуюцца з адлігай, а сонечныя дзянькі — з завеямі і снегападамі.

У пачатку года выпала столькі снегу, што многім мінчанам прыйшлося дабірацца на работу на метро, бо наземны транспарт працаваў з перабоямі. І гэта не дзіва: таўшчыня снежнага покрыва ў краіне дасягнула 16—39 сантыметраў, а на поўначы — амаль паўметра. На барацьбу са снежнай стыхіяй жыллёва-камунальныя гаспадаркі рэспублікі накіравалі 6,5 тысячы чалавек і 2,5 тысячы адзінак спецыяльнай тэхнікі. Толькі ў Мінску ў святочныя дні на ачыстцы вуліц, плошчаў і праспектаў працавала 300 адзінак аўтатранспарту.

Вялікую дапамогу дарожнікам аказвалі супрацоўнікі ДАІ. І як гавораць, няма ліха без дабра. Складаная сітуацыя на дарогах прымусіла вадзіцеляў быць больш пільнымі, у выніку чаго колькасць ДТЗ з цяжкімі наступствамі знізілася ў гэтыя дні ў 2 разы.

САВЕЦКІ ПАШПАРТ АДПРАЎЛЕНЫ Ў АРХІЎ

З пачатку 2002 года замежны пашпарт грамадзяніна СССР, якім да апошняга часу карысталіся некаторыя нашы суайчыннікі, прызнаны несапраўдным.

Яго ўладальнікі змогуць выехаць за мяжу толькі ў тым выпадку, калі зменяць гэты дакумент на новы беларускі пашпарт узору 1996 года. А такія пашпарты з гербам Рэспублікі Беларусь маюць ужо 6,5 мільёна нашых грамадзян. Таму ім няма прычыны хвалявацца.

А вось у астатніх могуць узнікнуць часовыя праблемы. І ў першую чаргу ў тых, хто знаходзіцца зараз за мяжой са старым пашпартам. Як паведамілі ў МЗС, гэтыя людзі павінны звярнуцца ў консульскі аддзел беларускага пасольства той краіны, дзе яны знаходзяцца, і атрымаць пасведчанне аб вяртанні дамоў. Знешнепалітычным ведамствам краіны распрацавана і працэдура тэрміновага атрымання новага беларускага пашпарта: напрыклад, у выпадку хваробы ці смерці за мяжой родзічаў або па рашэнні мясцовых уладаў за прадугледжаную заканадаўствам плату.

На здымку БелТА вучні 29-й школы Віцебска з новымі пашпартамі. Звыш 730 тысяч жыхароў Прыдзвінскага краю сталі за мінулыя пяць год уладальнікамі пашпартоў новага ўзору.

Падрыхтавала **Ларыса ЛАЗАР.**

спадчына

ВЕТКАЎСКІЯ СКАРБЫ

Пасля рамонту адкрыўся вядомы далёка за межамі Гомельшчыны Веткаўскі музей народнай творчасці.

Тут сабраны унікальныя стараверскія іконы, расшытыя золатам і жэмчугам, а таксама першыя рукапісныя кнігі і ручнікі стараверaў.

Рукапісным кнігам каля 500 гадоў. Гэтыя каштоўныя рэліквіі будуць цяпер захоўвацца па ўсіх музейных стандартах у сховішчах з пастаяннай тэмпературай і вільготнасцю паветра.

НА ЗДЫМКАХ: адрамантаваны будынак Веткаўскага музея народнай творчасці (помнік архітэктуры — былы жылы дом купца Т. Грошыкава); у залах музея.

Сяргей ХАЛАДЗІЛІН, БелТА.

ліставанне

ПОЛЬШЧА

Паважаная рэдакцыя "Голасу Радзімы"!

Сардэчна дзякую за цікавую газету "Голас Радзімы", якую атрымліваю сістэматычна.

З пашанай

Мікалай ПАНФІЛЮК.

ЛАТВІЯ

Хай здзяйсняюцца ўсе вашы мары, каб і надалей газета "Голас Радзімы" была сонечным злучнікам усіх беларусаў свету!

Станіслаў ВАЛОДЗЬКА.

Даўгаўпілс.

РАСІЯ

Жадаем здароўя, творчых поспехаў і ўсяго самага найлепшага, няхай заўсёды гучыць голас мілай Радзімы.

Юрый ЛАБЫНЦАЎ,
Ларыса ШЧАВІНСКАЯ,
Цэнтр беларусазнаўчых даследаванняў РАН.

Далейшага плёну ў працы!

Уладзімір КУНТЫШ.

Цвер.

актуальна

З'ЯВІЛІСЯ НАЯЎНЫЯ ЕЎРА

Наяўныя еўра з'явіліся ў абменных пунктах беларускіх банкаў на працягу першага тыдня студзеня.

22 снежня Нацыянальны банк Беларусі (НББ) накіраваў беларускім банкам тэлеграмы, якія рэгулююць парадак пераводу на еўра разлікаў у валютах краін — удзельніц еўрапейскага эканамічнага і валютнага саюза (ЭВС). НББ рэкамендаваў банкам змяніць дагаворы на разлікова-касавае абслугоўванне так, каб прадугледзець выкарыстанне еўра і выключыць магчымасць выкарыстання валют (ЭВС).

У 12 краінах еўрапейскага ЭВС наяўныя еўра — банкноты і манеты — уводзяцца ў абарачэнне з 1 студзеня 2002 года, а з 1 сакавіка 2002 года еўра стане адзіным плацёжным сродкам на тэрыторыі Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Грэцыі, Ірландыі, Іспаніі, Італіі, Люксембурга, Нідэрландаў, Партугаліі, Фінляндыі і Францыі.

Вераніка БОХАН.

віншаванні

ВОЛАТ З ПАЖЭЖЫНА

Больш за 800 гадоў найстарэйшаму на Беларусі дубу, які знаходзіцца ў вёсцы Пажэжын Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Людзі, якія жывуць тут, таксама адметныя сваім здароўем. Ці экалагічныя ўмовы таму спрыяюць, ці гены ў іх моцныя? Магчыма і першае, і другое. Але многія ў гэтых мясцінах самі займаюцца спортам, загартоўваннем.

У 20-градусны мароз мастацкі кіраўнік Пажэжынскага Дома культуры Андрэй ШТЫК настойліва даказвае: у здаровым целе — здаровы дух.

Раман КАБЯК, БелТА.

спорт

ХАКЕЙ. Беларуская маладзёжная зборная змагла захаваць месца ў дзесятцы мацнейшых пасля чэмпіянату свету ў Чэхіі.

У рашаючых паядынках беларусам прадстаяла ўступіць у барацьбу з французамі. У першым паядынку мацнейшымі аказаліся французы — 3 : 2. У другім матчы толькі пасля серыі булітаў удалося схіліць шалі на свой бок.

Тым часам наша нацыянальная хакейная каманда прыняла ўдзел у прадстаўнічым турніры ў Мінску. Беларусы перамаглі маскоўскія "Крылы Саветаў" — 5 : 3.

ЛЫЖНЫ СПОРТ. На кубку свету ў Германіі Вікторыя Лапаціна змагла заваяваць ва ўпартай барацьбе 8-е месца.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

ад першай асобы

АХОЎНІКАМ МЯЖЫ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА

Вынікі зробленаму ў мінулым годзе падвёў старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Беларусі генерал-лейтэнант Аляксандр ПАЎЛОЎСКІ падчас сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ.

Ён паведаміў, што за 11 месяцаў 2001 года праз дзяржаўную мяжу краіны прапушчана больш за 5 мільёнаў адзінак транспартных сродкаў і 21 мільён чалавек. Пры гэтым пагранічнікі каля 800 разоў сутыкаліся са спробамі незаконнага правозу праз мяжу матэрыяльных каштоўнасцей на суму прыкладна 700 мільярдаў рублёў. Акрамя таго, было выяўлена амаль 400 тайнікоў у транспартных сродках і грузах, затрымана ў якасці кантрабанды каля 70 тысяч долараў ЗША і 60 тысяч нямецкіх марак, а таксама больш за 300 чалавек з падробнымі і чужымі дакументамі, якія хацелі перасячы мяжу.

Самай вялікай праблемай на граніцы сёння з'яўляюцца нелегальныя мігранты і так званы "наркатрафік", г. зн. правоз праз беларускія межы наркотыкаў. Летась спынена больш за 60 груп незаконных мігрантаў агульнай колькасцю прыкладна паўтары тысячы чалавек і выяўлена звыш 30 каналаў перапраўкі іх праз мяжу, затрымана амаль 40 арганізатараў і памагатых незаконнай міграцыі. Па гэтых фактах узбуджана 17 крымінальных спраў.

Значнай падзеяй для пагранічных войскаў краіны стаў удзел у комплексным аператыўна-тактычным вучэнні "Нёман-2001", дзе адпрацоўваліся дзеянні ва ўмовах рэзкага абвастрэння становішча на пагранічнай тэрыторыі, а таксама арганізацыя і правядзенне пагранічнага пошуку па выяўленні і ліквідацыі бандыцкіх і іншых узброеных фарміраванняў.

Пасля іх заканчэння 11-ці ваеннаслужачым пагранвойскаў уручаны гадзіннікі з гравіроўкай "За мужнасць і воінскую доблесць". Усяго ж у 2001 годзе за заслугі па абароне дзяржаўнай мяжы 7 афіцэраў узнагароджаны ордэнамі "За службу Радзіме" 3-й ступені, адзін — медалём "За адвагу", 16 афіцэраў і прапаршчыкаў — медалямі "За выдатную службу па абароне дзяржаўнай мяжы", 11 ваеннаслужачых — медалямі "За выдатную службу", 19-ці афіцэрам датэрмінова прысвоены чарговыя званні, 110 ваеннаслужачых пагранвойскаў атрымалі медалі "За бездакорную службу".

Самай жа пачэснай узнагародай усяму саставу пагранічных войскаў стала значнае пашырэнне і ўдасканаленне інфраструктуры пунктаў пропуску, праца па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы пагранічнага кантролю ў маштабах усіх пагранвойскаў, замена маральна састарэлай тэхнікі на сучасныя ўзоры. Уведзены прынцыпова новыя падраздзяленні — лабараторыі па даследаванні дакументаў. Ідзе маштабная рэканструкцыя беларускай часткі пунктаў пропуску: на прыбалтыйскім напрамку — "Каменны лог — Мядзіннікай", "Катлоўка — Лаварышкес"; на польскім напрамку — "Брузгі — Кузніца Беластоцкая", "Бераставіца — Бабровнікі", "Казловічы — Кукурыкі", "Варшаўскі мост — Цярэспаль"; на ўкраінскім напрамку — "Новая Гута — Ярылавічы", "Макраны — Даманава", "Новая Рудня — Выступовічы". Прычым "Новая Гута" па сваіх параметрах моцна наблізілася да міжнародных стандартаў, і яе сутачная прапускная здольнасць павялічылася з 600 да 2 100 транспартных сродкаў.

У актыў камітэта можна занесці і далейшае развіццё міжнароднага супрацоўніцтва: з Літвой, Латвіяй, Украінай дасягнута дамоўленасць аб правядзенні сумесных аперацый, адбылося 13 рабочых сустрэч на ўзроўні кіраўнікоў пагранічных органаў гэтых краін, а таксама Расіі і Польшчы. Умацоўваецца ўзаемадзеянне з ФРГ, праведзены перамовы з прадстаўнікамі праваахоўных органаў Аўстрыі, Швецыі, Даніі.

Сёння на парадку дня стаяць пытанні будаўніцтва, адкрыцця і функцыянірання пунктаў спрошчанага пропуску. Толькі на прыбалтыйскім і ўкраінскім напрамках, паводле міждзяржаўных пагадненняў, павінна быць пабудавана адпаведна 23 і 30 такіх пунктаў. На ўкраінскім напрамку гатовы да адкрыцця 4 пункты спрошчанага пропуску, усе яны знаходзяцца на тэрыторыі Гомельскай вобласці. А вось у Брэсцкай вобласці іх няма, што стварае пэўныя цяжкасці для перасячэння мяжы насельніцтвам прыгранічных раёнаў. Так што наперадзе яшчэ шмат працы па забеспячэнні надзейнай аховы мяжы і адначасова паляпшэнні ўмоў яе перасячэння.

Алесь КОЛА.

узнагароды

ШАНУЕМ ТАЛЕНТЫ!

У нашай краіне з'явілася традыцыя: уручаць прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльныя прэміі Прэзідэнта менавіта ў Дзень Нараджэння Хрыстова.

Такая ўрачастыя цырымонія адбываецца ўжо шосты раз запар. Як адзначыў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, гэта сведчыць пра непарыўныя сувязі культуры і рэлігіі ў высакароднай справе нацыянальнага і грамадскага развіцця краіны. Сярод лаўрэатаў прэміі — таленавітыя і вядомыя людзі, якія ўнеслі вялікі ўклад у духоўнае адраджэнне грамадства і чалавека. У іх ліку — мастак-манументаліст Віктар Барабанцаў, іканапісец Павел Жараў, свяшчэннік Фёдар Крыванос і іншыя. Уручаны таксама спецыяльныя прэміі Прэзідэнта 22 лепшым дзеячам культуры і мастацтва.

На здымку БелТА: у час цырымоніі.

Ларыса ЛАЗАР.

сітуацыя

ПРЫЙШЛІ ХАЛАДЫ – МЕДЫКІ ЗАНЕПАКОЕНЫ

Беларускія медыкі занепакоены адсутнасцю інфармацыі ў рэспубліканскіх СМІ, якая б папярэджвала аб магчымых пераахаладжэннях арганізма падчас моцных маразоў. Ад пачатку зімовага сезона ў лячэбныя ўстановы Мінска дастаўлена каля 80 чалавек, што сталі ахвярамі моцных маразоў, зафіксавана некалькі лятальных выпадкаў у сувязі з пераахаладжэннем.

Каменціруючы гэту сітуацыю, спецыяліст Рэспубліканскага апекавага цэнтра Уладзімір Дарафеенка адзначыў, што агульнае пераахаладжэнне дзейнічае на арганізм прыгнятальна і выклікае пэўны сістэмны крызіс, асабліва аслабленых органаў. Моцны вецер, стрэс, цесны абутак, сардэчна-сасудзістыя захворванні, а таксама сталы ўзрост, калі назіраецца звужэнне сасудаў усяго арганізма, могуць стаць прычынамі, якія паспрыяюць халадовым траўмам. Часта ахвярамі становяцца рыбакі, асабліва азартныя. Яны атрымліваюць халадовыя траўмы ў моманты ўзмацнення клёву, калі ўвага канцэнтруецца на працэсе рыбалкі.

Спецыяліст папярэджвае, што «ў выпадку, калі пальцы пабялелі і сталі неадчувальнымі да холаду, а таксама калі канечнасці пакрыліся шэранню, ні ў якім разе нельга прымяняць цяпло". Неабходна накласці цеплаізаляцыйную павязку і звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

У. Дарафеенка таксама паведаміў, што, дзякуючы выкарыстанню новых метадаў меддапамогі пры абмарожаннях, на Беларусі скарацілася колькасць аперацый. Падчас аказання дапамогі ўрачы ўводзяць пацярпеламу ў артэрыі сасударасшыральныя і антытромбафлебітныя рэчывы. Дзякуючы такому метаду, у мінулым годзе "толькі 10 з 28 пацярпелых прыйшлося ампутаваць канечнасці". Раней ампутацыя пашкоджаных канечнасцей рабілася ў 100 працэнтах выпадкаў.

Вераніка БОХАН.

соцыум

ЗАГАРТОЎВАЙСЯ САМ

Саветам Міністраў адобраны праект "Дзяржаўнай праграмы па фарміраванні здаровага ладу жыцця насельніцтва Беларусі на 2002—2006 гады".

Міністр аховы здароўя Уладзіслаў Астапенка патлумачыў, што асноўная мэта Дзяржаўнай праграмы — стварэнне спрыяльных умоў для рэалізацыі прынцыпаў здаровага ладу жыцця ўсімі грамадзянамі краіны. Адна з задач, каб кожны адчуваў асабістую адказнасць за ўласнае здароўе і дзеля гэтага прытрымліваўся ўсіх неабходных правілаў. Гаворачы словамі міністра аховы здароўя, "трэба зрабіць так, каб быць здаровым стала модна".

Для дасягнення гэтых мэт перад органамі дзяржаўнага кіравання, мясцовымі выканаўчымі органамі ставяцца канкрэтныя задачы, выкананню якіх будзе спрыяць правядзенне шэрагу мерапрыемстваў. Перш за ўсё, гэта стварэнне міжведамаснага каардынацыйнага савета; удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў па пытаннях фарміравання здаровага ладу жыцця; развіццё сеткі і павышэнне эфектыўнасці работы існуючых устаноў, якія займаюцца аздараўленнем насельніцтва; ажыўленне фізкультурна-аздараўленчай работы сярод розных слаёў насельніцтва.

Гаворачы пра магчымыя вынікі рэалізацыі праграмы здароўя, Уладзіслаў Астапенка выказаў думку, што "займацца хаця б аздараўленчым бегам ды рабіць ранішнюю гімнастыку можа кожны".

Цяжка не пагадзіцца, што эфектыўнасць рэальнага ажыццяўлення праграмы па фарміраванні здаровага ладу жыцця залежыць не толькі ад ступені выканання дзяржаўнымі структурамі пастаўленых перад імі задач, але і ад ступені разумення і асэнсавання жыхарамі Беларусі адказнасці за стан свайго здароўя.

Валерый СІКІРЖЫЦКІ.

знак якасці

ПАНЧОХІ ДЛЯ ПАПЯЛУШКІ

Больш за 300 мадэлей панчошна-шкарпэтачных вырабаў на любы сезон выпускае ААТ "Брэсцкі панчошны камбінат". Асартымент абнаўляецца больш чым на 40 працэнтаў. За год выпускаецца больш за 50 мільёнаў пар.

Прадпрыемства — пастаянны ўдзельнік розных міжнародных выстаў, яго прадукцыя пастаўляецца ў краіны СНД, Польшчу, Балгарыю.

На здымку распрацоўшчыкі Вольга КАПУСЦІНА, Жанна ГАЧЫНА і Наталля ГЛУШАКОВА.

Фота **Рамана КАБЯКА**, БелТА.

здарэнні

ПРАТАРАНІЎ КАЛОНУ САЛДАТ

Сумна скончылася планавае "мыццё" ў лазні для 6 ваеннаслужачых дыслацыраванай у Брэсце мабільнай брыгады.

Яны сталі ахвярамі вадзіцеля, які на ўсёй хуткасці ўрэзаўся ў пешую калону салдат тэрміновай службы, што ішлі ў накірунку грамадскай лазні.

Наступствы гэтага сутыкнення былі б больш сур'ёзнымі, калі б не дрэнныя ўмовы надвор'я, якія, на шчасце, не дазволілі аўтамабілю развіць высокую хуткасць.

Алена РУДЗЬ.

аграсвет

МАЗЫРСКІЯ ФЕРМЕРЫ

Зямля... Спакон веку цягнецца да яе хлебароб, песціць, даглядае, яна ж аддзячвае чалавека шчодрымі дарамі. Магчыма, гэту ісціну ўзялі за аснову тыя, хто адважыўся весці фермерскую гаспадарку і прыйшоў у райвыканкам з просьбай аб выдзяленні зямлі для ўласнага землекарыстання.

У Мазырскім раёне Гомельшчыны налічваецца 13 сялянскіх гаспадарак, за якімі замацавана каля 210 гектараў зямельных угоддзяў. Большасць з тых, хто вырашыў самастойна працаваць на зямлі, — нядрэнныя гаспадары, якія ўжо маюць вопыт у земляробстве. Пераважна ўсе яны займаюцца вырошчваннем збожжавых, бульбы, агародніны, садавіны... Амаль ніхто не займаецца жывёлагадоўляй. Так, Аляксандр Пікуза пачынаў з трох гектараў зямлі, а пазней дадаткова прасіў райвыканкам аб выдзяленні яшчэ 116 гектараў. Ён, да таго ж, пачаў займацца развядзеннем норкі і шыншылы. Займець страусавую ферму не ўдалася, але гаспадар не губляе надзеі.

Нядрэнна ідуць справы ў сялянскіх гаспадарках Мікалая Шарамета і Фёдара Дордаля з Барбароўскага сельсавета. На адносна невялікіх зямельных надзелах гаспадараць Сяргей Чарняк, Алег Сабыніч і Аляксандр Юрчанка. Вядома ж, у кожнага з іх уласныя надзеі і планы, але яны пачалі сваю справу з асобым падыходам, а канкрэтныя вынікі іх дзейнасці толькі пацвярджаюць факты ўмелага землекарыстання і вядзення гаспадаркі.

Пётр ЖЭБРАК.

страхаванне

З НАДЗЕЯЙ У БУДУЧЫНЮ

У Беларусі дзейнічае як добраахвотнае, так і абавязковае медыцынскае страхаванне. Абавязковае распаўсюджваецца на замежных грамадзян, якія прыязджаюць на нашу тэрыторыю. Дарэчы, Беларусь засталася адзінай у СНД краінай, дзе замежным грамадзянам аказваецца бясплатная медыцынская дапамога.

Як паведаміў генеральны дырэктар Беларускага рэспубліканскага страхавога прадпрыемства "Белдзяржстрах" Віктар ШУСТ, самай вялікай папулярнасцю карыстаецца ў краіне маёмаснае страхаванне. За тэрмін пасля ўвядзення ў 1999 годзе абавязковага страхавання адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў змяніўся на станоўчы погляд на яго аўтааматараў. Аднак агульная страхавая культура ў Беларусі яшчэ на даволі нізкім узроўні. Людзі прывыклі разлічваць не на сябе, а на дапамогу дзяржавы. А на вёсцы ўвогуле не кожны здольны ўнесці страхавы ўзнос. Толькі некаторыя сельскія гаспадаркі могуць дазволіць сабе застрахавацца.

І ўсё ж "Белдзяржстрах", доля якога на страхавым рынку наблізілася да 60 працэнтаў, з надзеяй глядзіць у будучыню.

Максім НЯВІНСКІ.

служба 01

ЗАФІКСАВАНА 108 ПАЖАРАЎ

У першыя два дні новага года на тэрыторыі краіны адбылося 108 пажараў, у час якіх загінуў 21 чалавек.

Як паведамляе прэс-служба МНС Беларусі, прычынай пажараў, што адбыліся 1 і 2 студзеня, была неасцярожнасць падчас курэння людзей, якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Акрамя таго, зафіксаваны тры пажары, прычынай якіх сталі парушэнні правілаў пажарнай бяспекі падчас эксплуатацыі пячнога ацяплення.

У мінулым годзе на пажарах у першыя два дні года загінула 12 чалавек.

Алена РУДЗЬ.

меркаванне

ПЛАНУЕЦЦА ПРЫЦЯГНУЦЬ МІЛЬЯРД ДОЛАРАЎ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Сёлета ў беларускую эканоміку можа быць прыцягнута каля аднаго мільярда долараў ЗША замежных інвестыцый.

Як паведаміў, выступаючы ў беларускім парламенце, старшыня праўлення Нацыянальнага банка рэспублікі Пётр Пракаповіч, плануецца прыцягнуць каля 350 мільёнаў долараў замежных інвестыцый пад гарантыі ўрада, 200—250 мільёнаў долараў пад гарантыі Нацбанка. Астатнія сродкі могуць быць прыцягнуты за кошт стварэння сумесных прадпрыемстваў, акцыянірання і праз работу камерцыйных банкаў краіны з замежнымі партнёрамі, адзначыў П. Пракаповіч.

Зараз, на яго думку, галоўным тормазам у пытаннях прыцягнення замежных інвестыцый з'яўляецца адсутнасць валютаакупляемых праектаў. Між тым, галоўнымі крыніцамі прыцягнення інвестыцый з'яўляюцца ўнутраныя рэзервы эканомікі краіны, сказаў старшыня Нацбанка.

П. Пракаповіч нагадаў, што да 1 студзеня 2002 года камерцыйныя банкі Беларусі павінны былі давесці памер сваіх устаўных капіталаў да 10 мільёнаў еўра. У адваротным выпадку з банкаў будуць адкліканы ліцэнзіі на работу з укладамі насельніцтва. Па яго словах, некаторыя вядучыя банкі краіны ўжо выканалі ўсе неабходныя ўмовы па фарміраванню ўстаўнога капіталу для працы з фізічнымі асобамі. Шэраг банкаў прадаставілі Нацбанку графікі фарміравання капіталу ў памеры 10 мільёнаў еўра. Але 5 камерцыйных банкаў заявілі, што не змогуць выйсці на ўласны капітал 10 мільёнаў еўра і вярнуць уклады насельніцтву ў адпаведнасці з дагаворамі. "Гэта ні ў якім разе не ўскладніць сітуацыю з прыцягненнем сродкаў насельніцтва", — заявіў П. Пракаповіч.

Па словах старшыні Нацбанка, сёлета плануецца панізіць стаўку рэфінансавання з 48 да 28—30 працэнтаў. П. Пракаповіч не выключае, што ўжо да чацвёртага квартала 2002 года Беларусь выйдзе на ўзровень Расіі па стаўцы рэфінансавання. "Галоўнае — прытрымлівацца запланаванага ўзроўню інфляцыі", — заявіў П. Пракаповіч.

Алена РУДЗЬ.

супрацоўніцтва

КІТАЙ – БЕЛАРУСЬ: 10 ГОД ЗБЛІЖЭННЯ

Кітай выступае супраць умяшання іншых дзяржаў ва ўнутраныя справы Беларусі пад любым выглядам. Пра гэта ў Пекіне ў інтэрв'ю групе беларускіх журналістаў заявіў намеснік дырэктара дэпартамента Усходняй Еўропы і Сярэдняй Азіі МЗС Кітая Чжоу Лі.

Пры гэтым дыпламат нагадаў, што для ўсталявання паўнаважных адносін з дзяржавамі Еўрасаюза Кітаю таксама спатрэбіўся некаторы час. Спачатку ў адносінах паміж краінамі існавала пэўнае неразуменне. У прыватнасці, мелі месца разыходжанні па пытаннях захавання правоў чалавека, а таксама па тыбецкім пытанні. Потым з'явіліся зрухі да ўзаемазгоды. Чжоу Лі адзначыў, што па ўсіх праблемах сёння паміж Кітаем і дзяржавамі ЕС "ідзе дыялог".

Дыпламат заявіў, што кітайскі бок паважае выбар любога народа, зроблены з улікам яго гістарычных і нацыянальных асаблівасцей. Ён упэўнены: наладжваць супрацоўніцтва паміж дзяржавамі можна толькі шляхам правядзення дыялогаў.

Чжоу Лі напомніў, што 20 студзеня гэтага года Беларусь і Кітай адзначаць 10-ю гадавіну з дня ўсталявання паміж імі дыпламатычных адносін. Па словах суразмоўцы, "увесь той час, незалежна ад палітычнай сітуацыі, адносіны паміж рэспублікамі развіваліся па нарастаючай". Выпрабаванні, што выпалі на долю абедзвюх дзяржаў, даказалі, што Беларусь і Кітай — надзейныя партнёры.

Дакументальным пацвярджэннем таго, падкрэсліў ён, стала падпісанне ў мінулым годзе падчас сустрэчы лідэраў дзвюх дзяржаў Цзянь Цзэміня і Аляксандра Лукашэнкі "чацвёртай сумеснай дэкларацыі аб сяброўстве і супрацоўніцтве, якія павінны будавацца на аснове доўгачасовай стабільнасці, даверу і павагі паміж рэспублікамі".

Суразмоўца нагадаў, што абедзве краіны займаюць у рамках міжнародных арганізацый агульную пазіцыю і па пытаннях бяспекі. У прыватнасці, Беларусь, Кітай і Расія выступілі на пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН з агульнай заявай адносна мэтазгоднасці захавання дагавора аб процракетнай абароне, якая, на думку аўтараў заявы, "з'яўляецца важным дакументам па падтрымцы стратэгічнай стабільнасці ва ўсім свеце".

Чжоу Лі заявіў таксама, што Беларусь і Кітай знаходзяцца сёння ў стане пошуку новых шляхоў супрацоўніцтва. Па словах дыпламата, у гэтым кірунку ёсць істотныя зрухі. Напрыклад, Кітай мае намер прыняць удзел у праекце будаўніцтва ў беларускай сталіцы ўраёне выставачнага цэнтра па праспекце Машэрава сучаснай тэлевежы.

Прадстаўнік МЗС КНР звярнуў увагу на тое, што эканамічныя структуры Беларусі і Кітая ўзаемадапаўняльныя. Вынікі супрацоўніцтва ў гэтай галіне Чжоу Лі ацаніў як "здавальняючыя".

Дыпламат таксама паведаміў, што да 10-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі Кітай прымеркаваў выпуск памятных канвертаў, прысвечаных гэтай даце.

Сяргей ВОЛКАЎ.

ракурс

У КРАІНЕ ПРЫГАЖУНЬ ЁСЦЬ ПРАЦА І ДЛЯ КАСМЕТОЛАГАЎ

Прыгажосць беларускіх дзяўчат вядомая ўсяму свету. Шчодра надзяліла нас прырода. Ды і не бывае непрыгожай маладосці. Але падараванае звыш трэба шанаваць, даглядаць. І тут заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу спецыялісты-касметолагі.

Першы касметалагічны цэнтр на Беларусі з'явіўся 20 гадоў таму ў Мінску. Неўзабаве падобныя цэнтры адкрыліся ў абласных гарадах, былі арганізаваны касметалагічныя кабінеты пры паліклініках і бальніцах (размова не ідзе пра дэкаратыўную касметалогію, паслугі якой здаўна аказвалі цырульні і іншыя ўстановы службы быту). Усяго ў краіне толькі ў дзяржаўных установах працуе 40 урачоў-касметолагаў і 82 медсястры гэтага профілю. Акрамя іх, адпаведныя ліцэнзіі маюць 50 недзяржаўных арганізацый.

Стаць хірургам-касметолагам няпроста. Спачатку патрэбна вышэйшая медыцынская адукацыя, пасля пяць гадоў хірургічнай практыкі. І толькі тады з'яўляецца права вучыцца па спецыяльнасці пластычная хірургія. Навучанне платнае. Пасля — курсы спецыялізацыі. Толькі высокакваліфікаваны спецыяліст можа адолець усе гэтыя "перашкоды".

Летась у дзяржаўныя касметалагічныя цэнтры звярнуліся і атрымалі дапамогу звыш 126 тысяч чалавек. Натуральна, 90 працэнтаў з іх — жанчыны, але і некаторыя прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва неабыякавыя да свайго знешняга выгляду.

Найчасцей звяртаюцца людзі ва ўзросце ад 40 да 50 гадоў, ды і не дзіва: другая маладосць. Але ёсць і зусім маленькія пацыенты. Напрыклад, шасцігадовы хлопчык наадрэз адмаўляўся ісці ў школу з-за вялікіх вушэй. Аперацыя па карэкцыі формы вушэй — самая распаўсюджаная сярод кліентаў да 11 гадоў.

Асаблівым попытам карыстаюцца ліфтынг і ліпаксацыя. З паслуг тэрапеўтычнай касметалогіі — лекавы догляд скуры твару, шыі і цела, розныя віды масажу, выдаленне дробных касметалагічных дэфектаў.

Зразумела, касметалогія адносіцца далёка не да самага неабходнага, хутчэй, да самага жаданага. Таму яе паслугі нават у дзяржаўных цэнтрах платныя. І, нягледзячы на тое, што кошт вызначаецца згодна з прэйскурантам Міністэрства аховы здароўя, не кожная жанчына можа дазволіць сабе падцяжку скуры твару за 350 долараў. Падцяжка скуры павек каштуе каля 100 долараў, за карэкцыю вушэй даводзіцца аддаць 120 долараў. Тым не менш, чэргі ў дзяржаўных цэнтрах — ад трох да шасці месяцаў. Безумоўна, не ўсім, хто жадае, дапамагаюць. Пацыента спачатку абследуюць і толькі пры адсутнасці супрацьпаказанняў аперыруюць. Адмаўляюць жа ў год прыблізна 30 працэнтам жадаючых. Акрамя стану здароўя, глядзяць і на ўзрост: старэйшым за 65 гадоў вельмі рэдка бяруцца дапамагаць. Нягледзячы на падпіску кліента, што ён папярэджаны пра ўсемагчымыя пабочныя негатыўныя эфекты, адказнасць усё роўна ляжыць на ўрачах.

Але прыгажосць патрабуе ахвяр. Нават у краіне, дзе ўсе самыя прыгожыя.

Злата ГУРЫНОВІЧ.

юбілеі

Герой Вялікай Айчыннай Мінай Шмыроў нарадзіўся 23 снежня 1891 года. У дзіцячым узросце пасвіў скаціну ў заможных сялян, потым сплаўляў па рацэ лес, працаваў у маёнтку буйнога магната. Знаёмства з ваеннай справай адбылося ў 1913 годзе, калі Шмырова ўзялі на службу ў царскую армію. Удзельнічаў у першай сусветнай вайне, нават быў узнагароджаны Георгіеўскімі крыжамі. А ў 1918 годзе добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, ваяваў супраць Краснова, Карнілава і Юдзеніча. Арганізаваў першы ў Віцебскай губерні партызанскі атрад, быў камандзірам атрада па барацьбе з бандытызмам. Мінай Піліпавіч удастоены высокай па тых часах узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга.

ЛЕГЕНДАРНЫ БАЦЬКА МІНАЙ

У 1932 годзе яго выбралі старшынёй калгаса ў роднай вёсцы Пунішча, пасля ён прызначаўся дырэктарам ільнозавода, кардоннай фабрыкі. Усюды цалкам аддаваў сябе працы, хаця перад вайной памерла жонка і ўвесь клопат па выхаванні чацвярых дзяцей таксама прыйшлося ўзяць на сябе. Адным словам, і даваеннай біяграфіі Шмырова хапіла б на цэлае жыццё.

Бацькам жа Міная Піліпавіча сталі называць рабочыя кардоннай фабрыкі, з якімі ён пайшоў у партызаны пасля таго, як 12 ліпеня 1941 года гарадскі пасёлак Сураж быў заняты фашыстамі. І ў тым жа месяцы гэты невялікі партызанскі атрад атрымаў баявое хрышчэнне — на ціхай рэчцы Тураўцы ў вёсцы Цімохі разбіў кадравую фашысцкую часць. Адсюль па акупіраваных сёлах Віцебшчыны пайшла гордая слава няскоранага Бацькі Міная, якая не давала спакою захопнікам. За яго галаву яны абяцалі карову, каня, надзел зямлі, дзесяткі тысяч марак. Але здрадніка, якога б спакусілі варожыя абяцанні, не знайшлося. Тады фашысты арганізавалі карную экспедыцыю, узялі пад залог дзяцей камандзіра, якіх пасля расстралялі. Спадзяваліся, выдаць, зламаць Бацьку Міная.

Шмыроў на паклон да ворага не пайшоў. Пасля цяжкіх выпрабаванняў партызанскія атрады суражскай зоны зліліся ў моцны баявы кулак — у красавіку 1942 года была створана Першая Беларуская партызанская брыгада, якую ўзначаліў Мінай Піліпавіч. Разам з армейскімі часцямі партызаны ўтрымлівалі вядомыя "суражскія вароты" — 40-кіламетровы разрыў нямецкай лініі фронту, праз які на папаўненне ваюючых савецкіх войскаў было перапраўлена 20 тысяч баяздольных мужчын, а 4-й ударнай арміі, што займала суседні плацдарм, адпраўлена шмат бульбы, хлеба, фуражу. Праз "вароты" на Вялікую зямлю ішлі жанчыны, дзеці, старыя. Партызанам аказвалася дапамога кадрамі, зброяй, медыкаментамі.

Партызанская брыгада Бацькі Міная стала паўнапраўным гаспадаром на сваёй тэрыторыі. Яе штаб меў тэлефонную сувязь са штабам 4-й ударнай арміі і з усімі партызанскімі атрадамі. У суражскай, а яшчэ яе называлі мінаеўскай, зоне дзейнічалі райкам партыі і райвыканкам, калгасы і саўгасы. Гэта, сапраўды, быў востраў Савецкай улады ў тыле ворага ў 1942 годзе.

Пасля вайны Мінай Піліпавіч працаваў намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама, быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

П. ПАБОКА, БелТА.

Фота з архіва БелТА.

розныя — роўныя

БУКВАР ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ

18 тысяч сляпых і слабавідушчых грамадзян нашай краіны звязваюць свае надзеі на адукацыю з працай невялікага калектыву адной з рэдакцый выдавецтва "Полымя".

У часы СССР кнігі для чытання і падручнікі для сляпых атрымлівалі з Расіі. З распадам Саюза ў Беларусі востра паўстала пытанне стварэння ўласнай базы па выпуску такіх кніг і падручнікаў. Распрацоўка тэхналогіі вытворчасці, набыццё спецыяльнай паперы, падрыхтоўка паліграфічнай базы і вялікая праца па пераводу падручнікаў на друк шрыфтам Брайля — усё гэта клопаты рэдакцыі.

НА ЗДЫМКУ: загадчык рэдакцыі па выпуску літаратуры шрыфтам Брайля Вячаслаў АНІКОВІЧ і рэдактар Таццяна БЯЛІНСКАЯ чытаюць карэктуру.

Фота БелТА.

выставы

ЗДЗІЎЛЯЕ ВЫРАЗНАСЦЬ

Выстава жывапісу адбылася ў галерэі мастацтваў Гомеля. Яе аўтар Пётр Захараў з Мазыра — галоўны мастак драматычнага тэатра імя Івана Мележа.

Мастаку споўнілася 65. Ён неаднаразовы ўдзельнік і дыпламант многіх міжнародных выстаў, аформіў дзесяткі спектакляў.

На адкрыцці выставы Пётр Захараў атрымаў віншаванне ад Саюза мастакоў Беларусі.

Пётр ЖЭБРАК.

пасляслоўе

ГОД МОЎ ФІНІШАВАЎ

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце (МДЛУ) адбылося ўрачыстае завяршэнне Еўрапейскага года моў у Беларусі.

На пачатку сустрэчы слова ўзяла рэктар МДЛУ Наталля Баранава. Як вядома, гэтая акцыя, у якой прымалі ўдзел 45 краін свету, праводзілася па ініцыятыве Савета Еўропы і Еўрасаюза. Афіцыйнае ж закрыццё Года моў адбылося 8 снежня ў сталіцы Бельгіі Бруселі. Па агульным меркаванні прадстаўнікоў усіх без выключэння еўрапейскіх дзяржаў, Год моў набыў выгляд своеасаблівага моста дзеля нападжвання зносін паміж народамі з рознымі моўнымі і культурнымі традыцыямі, заснаванымі на цярпімасці і ўзаемаразуменні. Адпаведна, у краінах Старога Свету прайшоў шэраг мерапрыемстваў, сярод якіх неабходна адзначыць Тыдзень вывучэння замежных моў дарослымі, агульнаеўрапейскі Дзень моў, увядзенне ў дзейнасць моўнага партфеля, шэраг буйных міжнародных канферэнцый.

Шмат падзей адбылося і ў нашай краіне. Асаблівай увагі вартыя выпуск першага нумара навукова-метадычнага часопіса "Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь", стварэнне Рэспубліканскага цэнтра лінгвістычнай адукацыі, адкрыццё Цэнтраў турэцкай і італьянскай моў... Больш за 3 тысячы беларускіх школьнікаў удзельнічалі ў конкурсе на лепшае сачыненне, прысвечанае мовам. Пераможцамі сталі 33 чалавекі.

Урачыстасць ва універсітэце была вельмі цікавай. Больш за 2 гадзіны на сцэне МДЛУ спяваліся песні, чыталіся вершы на 14 мовах. Здавалася, паядналіся культурныя пласты народаў Беларусі, Германіі, Іспаніі, Італіі, Кітая, Расіі, Турцыі, Францыі, Швецыі, Японіі... Адным словам, дэвіз Еўрапейскага года моў — "Адзінства ў разнастайнасці" — цалкам апраўдаў сябе.

Саветам Еўропы прынята рашэнне аб правядзенні 26 верасня штогадовага Дня моў.

Алесь ЛІПЕНЬ.

гастролі

БРАЗІЛЬСКІЯ РЫТМЫ НА МІНСКАЙ СЦЭНЕ

У беларускую сталіцу завітаў сусветна вядомы бразільскі гітарыст Фабіа Занон. Канцэрт знакамітага выканаўцы адбыўся ў зале Палаца культуры трактарнага завода.

Для канцэрта быў падабраны менавіта той рэпертуар, які найбольш яскрава прадстаўляе музычную культуру Бразіліі. Прагучалі творы бразільскіх кампазітараў XX стагоддзя (Э. Віллапа-Лобас, Ф. Міньоне). Еўрапейскую музычную спадчыну прадстаўлялі перапажэнні для гітары клавірных кампазіцый італьянскага кампазітара Д. Скарлаці. Увогуле рэпертуар музыканта вялікі. Адных толькі канцэртаў для гітары налічваецца больш за дваццаць.

Слухачоў захапіў сапраўдны бразільскі тэмперамент, а таксама шчырасць і пранікнёнасць выканання. Фабіа Занон — лаўрэат прэстыжных конкурсаў — імя Францыска Тарэгі ў Іспаніі і міжнароднага конкурсу гітарыстаў у ЗША. Найбольш вызначальнай з'яўляецца спецыяльная прэмія Бразіліі, якую Фабіа атрымаў за вялікі ўклад у развіццё бразільскай музыкі. Дарэчы, сярод упадальнікаў гэтай прэміі такія сусветна вядомыя асобы, як архітэктар О. Німеер і пісьменнік Ж. Амаду.

Безумоўна, сольны канцэрт Фабіа Занона ўнёс яркія фарбы ў музычнае жыццё нашай краіны.

Сафія ЗОШЧЫК.

жыццёвыя сюжэты

НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ...

75-гадовы шлях прайшлі разам Аляксандр і Алена Шпакі з вёскі Церахавічы Славаціцкага сельсавета, што на Гродзеншчыне.

Біяграфія гэтай сям'і пачыналася даволі незвычайна для гаспадара.

Бацька яго загінуў на вайне, а маці Алена памерла, калі Алесь быў зусім малым. Працяглы час падлеткам ён пасвіў кароў у Цяглевічах і рос добрым хлопцам. Людзі параілі яму, тады шаснаццацігадоваму юнаку, пасватацца да Алены, якой тады ўжо было дваццаць пяць...

Тут часта згадваюць, як на Новы год ехаў у сваты, як у Славаціцкай царкве не хацелі даваць шлюб, бо жаніху было замала гадоў. Пра тое, як змалку да самай старасці працавалі да ўтомы ў мясцовым калгасе і на сваёй гаспадарцы, каб мець нейкі харчовы набытак. Шмат гадоў Алена Дзянісаўна адпрацавала ў паляводстве, а Аляксандр Іванавіч — у жывёлагадоўлі даглядчыкам на ферме "Манцякі", конюхам, выконваў іншыя даручэнні брыгадзіра.

Маладосць Аляксандра Іванавіча, як і яго пакалення, прыпала на гады другой сусветнай вайны. Чырвонаармеец Шпак служыў на I Беларускім фронце ў 1015 артыперыйскім палку. Пад Варшавай быў паранены. Асколак снарада і зараз — напамінак пра ваенныя паходы. Узнагароджаны баявымі медалямі: "За вызваленне Варшавы", "За баявыя заслугі", "За перамогу над Германіяй".

Не ўтрымаўся ад спакусы спытаць, якія якасці характару найбольш важныя пры выбары спадарожніка жыцця. Алена Дзянісаўна адказала так: мужчына павінен быць надзейным і працавітым, бо менавіта ад гэтага залежыць цеплыня ўзаемаадносін. Аляксандр Іванавіч дыпламатычна заўважыў, што жанчына павінна ўмець калі-небудзь і ўступіць мужу, больш прыслухоўвацца да яго думкі, меркаванняў...

Як жа складваліся ўзаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі?

Дачка Надзея Аляксандраўна жыве ў гэтай жа вёсцы. Я сустрэў яе ля хаты старых. Надвячоркам яна ішла, каб прынесці вады, прапаліць печку і, увогуле, паглядзець бацькоў. Аднак руплівая гаспадыня Алена Дзянісаўна сама стараецца ўпраўляцца па дому.

Старэйшых Шпакоў шануюць і малодшыя нашчадкі — чацвёра ўнукаў, столькі ж праўнукаў, два прапраўнукі.

Гэтае знаёмства выклікала замілаванне: як жа добра, што ёсць на Зэльвеншчыне такія дружныя сем'і, якія грунтуюцца на самапавазе і ўзаемадапамозе, дабрыні і спагадзе — адвечных каштоўнасцях жыцця.

Пётр ЖЭБРАК.

асоба

СОНЦА ДАЛОННЮ НЕ ЗАКРЫЕШ...

Чалавек і космас... Нават зараз, калі для ўсіх асваенне космасу стала рэальнасцю, цяжка паверыць, што ўсё гэта не выдумка, не фантазія.

1881 год. Прыгавораны да смяротнай кары за ўдзел у замаху на жыццё цара Аляксандра II студэнт Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі Мікалай Кібальчыч прапанаваў ідэю і схему лятальнага апарата, які быў цяжэйшы за паветра і прыводзіўся ў рух парахавым рухавіком. Гэта першы вядомы праект пілатуемага ракетнага апарата не ў рамантычных фантазіях, а ў тэхнічнай распрацоўцы.

36 гадоў (да кастрычніка 1917 года) гэтая смелая навукова-тэхнічная ідэя была захавана ў жандарскіх архівах. К. Цыялкоўскі быў першым вучоным, які ацаніў патэнцыяльныя магчымасці ракет для выхаду чалавека за межы Зямлі. Ён па праву лічыцца заснавальнікам касманаўтыкі. Цыялкоўскі казаў, што пакарэнне космасу дасць чалавеку "горы хлеба і бездань магутнасці".

...Лета 1955 года. Спецыяльны камітэт па правядзенні Міжнароднага геафізічнага года сабраўся на чарговае пасяджэнне ў Барселоне. Савецкі вучоны акадэмік І. Бардзін паведаміў камітэту пра намер нашай краіны запусціць у космас штучны спадарожнік Зямлі. Тады гэтай заяве не надалі асаблівай увагі. Больш таго, нехта за акіянам не без яхіднасці гаварыў пра "валасатага мядзведзя", які хоча сваімі лахматымі лапамі зрабіць самы тонкі гадзіннік". Бо яшчэ ў красавіку 1946 года амерыканская Нацыянальная акадэмія навук паспяшалася заявіць: "...Першы штучны Месяц будзе нашым". Прычым, усё гэта гучала як факт, які ўжо адбыўся. Амерыка абяцала здзівіць свет.

Год 1957-мы, 4 кастрычніка. У той дзень на небасхіле з'явілася новая "зорка". Упершыню лятальны апарат, створаны рукамі чалавека, ажыццявіў палёт у космас. Маленькі металічны шар з вусамі антэн парушыў векавое маўчанне космасу. "Бип-бип-бип...". Першы спадарожнік гаварыў на рускай мове! За мяжой яго называлі "чырвоным месячнікам", замежныя газеты — "рускім цудам".

"90 працэнтаў размоў пра штучны спадарожнік Зямлі прыпадала на долю ЗША. Як аказалася, 100 працэнтаў справы прыйшлося на долю Расіі...", — канстатавалі аглядальнікі Асашыэйтэд Прэс.

Іван Міско у коле сяброў — савецкіх касманаўтаў (побач Пётр КЛІМУК).

Такім чынам, 4 кастрычніка 1957 года — пачатак касмічнай эры.

"Сонца далонню не закрыеш!" — вучыць народная мудрасць. Савецкі Саюз адкрыў чалавецтву шлях у космас. На яго рахунку запуск першых спадарожнікаў, аўтаматычных станцый да Месяца, палёт першага касманаўта свету Юрыя Гагарына.

А зараз вернемся да Беларусі. Хочацца расказаць пра чалавека, які сваё жыццё таксама звязаў з космасам. Толькі гэта не касманаўт, хаця Беларусь падарыла космасу сваіх Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка. Гэта чалавек культуры. І яго імкненне да сонца, да зорак праявілася ў працы ў скульптурна-партрэтнай галерэі, якая так і называецца "Інтэркосмас". Гэта Іван Міско, які хутка адзначыць свой 70-гадовы юбілей.

За сваё жыццё ён зрабіў шмат. У творчым калектыве сумесна са скульптарамі і Мікалаем Рыжанковым, Андрэем Засніцкім, архітэктарам Алегам Трафімчуком ён стварыў помнік рускаму пісьменніку Максіму Горкаму ў Мінску, помнік маці-патрыётцы Анастасіі Купрыянавай у горадзе Жодзіне. За апошнюю работу аўтарскаму калектыву ў 1977 годзе было прысвоена званне лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР. Помнік стаў абагульняючым вобразам тужлівых маці, якія згубілі сваіх сыноў і дачок на вайне. А ў 1989 годзе Івану Міско было прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі.

Але ж так здарылася, што галоўнай тэмай яго далейшай творчасці стала касманаўтыка. Першую сваю работу — партрэт касманаўта № 1 Юрыя Гагарына — Іван Міско зрабіў у дзень пахавання касманаўта пад гукі жалобнай музыкі. Зараз у яго майстэрні цэлая галерэя партрэтаў касманаўтаў розных краін свету: ЗША, Англіі, Францыі, Аўстраліі, Афганістана, Польшчы, Румыніі, Германіі і іншых. Тут усіх сустракае мацярынскім позіркам маці Юрыя Гагарына — Ганна Цімафееўна, ветліва ўсміхаюцца Пётр Клімук і кубінскі касманаўт Арнальда Тамаё Мендэс. Побач можна ўбачыць савецка-французскі экіпаж, які быццам бы толькі выйшаў з карабля.

Калі касманаўты прыязджаюць на Беларусь, то абавязкова наведваюць майстэрню скульптара — маленькі касмічны музей. Акрамя скульптурных партрэтаў, у Івана Акімавіча шмат фотаздымкаў з зорнага гарадка і розных падарункаў ад гасцей. Сярод іх — кніга, падораная Ганнай Гагарынай, памятныя медалі, якія пакінулі касманаўты з розных краін. Ёсць тут і медаль, выраблены самім Іванам Міско да 20-годдзя палёту ў космас першага чалавека.

Дзверы майстэрні Івана Міско адчынены для ўсіх. Дарэчы, яны ўсе спісаны аўтографамі. У куце, на невялікім століку, стаіць самавар з гарбатай, адкуль ідзе пах мяты і зверабою. Часта заходзяць сябры, знаёмыя. Іван Акімавіч марыць, што калі-небудзь майстэрня стане музеем, ён пра гэта збіраецца размаўляць з мэрам горада.

Я зайшла, калі майстар працаваў над невялікай фігуркай вядомага музычнага дзеяча Віктара Роўды.

— Цяпер мару зрабіць помнік Сапегу, — сказаў творца. — Гэта асоба, да таго ж мой зямляк, са Слонімшчыны. Маю шмат задумак. Кожную раніцу прыходжу ў сваю майстэрню і думаю: ніхто мяне не кантралюе, ніхто не прымушае. Сам іду. Часам задумваюся: ці будзе гэта патрэбна каму, калі мяне не стане? Усё ж маё жыццё, у святы і будні, праходзіць у майстэрні. Я нават, калі прызначаю сустрэчы, гавару: "Каля двух камянёў, каля майстэрні Міско".

Трымаю ў руках тэлеграму ад Пятра Клімука, якую ён некалі даслаў Івану Акімавічу. А ў ёй напісана: "Нас і нашу працу вы прапусцілі праз трапяткое сэрца мастака, а напрацаванымі рукамі стварылі вобразы і справы сучаснікаў".

Чытаю і думаю: сонца далонню не закрыеш...

Галіна ДЗЯТЛОЎСКАЯ.

Іван МІСКО з амерыканскімі астранаўтамі Томасам СТАФАРДАМ і Эдвінам ОЛДРЫНАМ.

спадчына

СВЯТЛО МІНУЎШЧЫНЫ

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

Каб адчуць яго сонечнае ўздзеянне, раю заглянуць у адну з аўдыторый (а дакладней, № 571) галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. І душа вашая, пазбавіўшыся гарадскога тлуму, ажыве і суцішыцца ў радасным узрушэнні ад судакранання з родным і любым, што раней можна было ўбачыць у кожнай прыстойнай беларускай сям'і, у святочна-кірмашовых строях нашых адухоўлена прыгожых дзяўчат, маладзіц і бабулек.

Але ў пэўным часе мінулы дваццаты век наўгалоп паляцеў наперад, і традыцыйная, што складвалася тысячагоддзямі, культура ўсё больш выцяснялася на ўзбочыну гісторыі. Зберагчы спадчыну продкаў — такое прызначэнне мае згаданая вышэй аўдыторыя і кафедра тэорыі і гісторыі культуры, якая ёю апякаецца.

Кафедра перасягнула сёлета дзесяцігадовы рубеж, а аўдыторыя ад пачатку свайго, скажам так, адухаўлення — пяцігадовы. Узначальвае выкладчыцка-навуковы калектыў доктар навук, прафесар, сябра беларускіх пісьменнікаў, а калі без рэгалій, а па сутнасці, то проста разумны і таленавіты чалавек **Аляксей Рагуля.**

У сталым штаце кафедры 16 чалавек. На жаль, пра кожнага з іх у газетным матэрыяле не скажаш.

Імя **Уладзіміра Васілевіча** ў навуковым і літаратурным, творчым асяроддзі добра вядомае. Мог бы, каб хацеў, даўно стаць сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Але беларуская сціпласць у ягоным характары пераважае. Асабліва значны плён ім сабраны на ніве беларускай народнай творчасці. Чаго варты трохтомны фальклорны збор, які імгненна разышоўся адразу пасля выхаду.

Уладзіміру Аляксандравічу належыць ідэя і першынство ў аздабленні той самай пяцьсот семдзесят першай аўдыторыі, своеасаблівага музея, дзе багата прадстаўлены па рэгіёнах беларускае народнае ткацтва, вышыўка, разнастайныя прадметы побыту. Дарэчы, увесь гэты неацэнны скарб ахвяраваўся музею бясплатна вясковымі людзьмі, да якіх штолета спадар Васілевіч прыязджаў са студэнтамі запісваць песні, замовы і абрады.

Ананімных дарункаў у гэтай захавальніцы народных скарбаў няма. Калі ты прынёс сюды нават такую мала прыкметную рэч, як верацяно, усё адно тваё прозвішча будзе занесена ў агульны спіс ахвярадаўцаў. А на саміх рэчах ёсць пазнакі, адкуль і ад каго яны паходзяць. Але найбольш поўную характарыстыку можна прачытаць у адмысловай кнізе, якая захоўваецца тут жа.

Аднак, калі гаворым пра музей, то маем на ўвазе не толькі экспанаты, але і іх упарадкаванне — экспазіцыю. На гэта звычайна таксама патрэбны немалыя сродкі. Але і тут абышліся сваімі сіламі. На кафедры ад дня яе заснавання працуе няўрымслівы чалавек **Алесь Шамак**, які доўгі час узначальваў Мінскі гарадскі бацькоўскі камітэт і шмат зрабіў для арганізацыі нацыянальнай асветы, а тут выступіў як дызайнер, стварыўшы агульную канцэпцыю гэтай унікальнай выставы.

Хачу адзначыць цікавую асаблівасць навучання ва ўстанове, што носіць імя адданага роднаму краю паэта Максіма Танка. Рэктарам БДПУ працуе **Леанід Ціханаў**, па нараджэнні чалавек рускі, што зусім не замінае яму быць патрыётам Беларусі, глыбока разумець праблемы нацыянальнай адукацыі ў нашым краі. Таксама, як разумелі іх іншыя высокаадукаваныя і культурныя людзі, напрыклад, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Уладзімір Пічэта, які нарадзіўся на Украіне ў Палтаве, а па нацыянальнасці быў сербам. Ды гэта не перашкодзіла яму, калі трапіў на Беларусь, дасканала вывучыць нашу мову, больш таго, стаць адным з рухавікоў беларускага Адраджэння 20-х гадоў. Прыкладаў такога сапраўднага братняга стаўлення да роднаснага славянскага народа можна прыводзіць шмат.

Кафедра, якую ўзначальвае Аляксей Рагуля, забяспечвае выкладанне тут такіх дысцыплін, як айчынная і сусветная культура, фальклор і этнаграфія. Апрача гэтага, яе супрацоўнікі часта, нават часцей, чым літаратурныя кафедры, выступаюць ініцыятарамі розных сустрэч, у тым ліку і з беларускімі пісьменнікамі. Так, зусім нядаўна ладзіліся вечарыны з Нілам Гілевічам і Генадзем Бураўкіным. У сценах той жа аўдыторыі адбылася навукова-практычная канферэнцыя "Традыцыйная народная культура і сучаснасць", куды я і атрымаў запрашэнне. І, прыйшоўшы, не пашкадаваў.

Распачаў пасяджэнне ўдумлівым уступным словам дэкан факультэта беларускай філалогіі **Аляксандр Лугоўскі.** Асноўным дакладчыкам быў Аляксей Рагуля. Ягонае выступленне вызначалася не толькі грунтоўнасцю, але і гучала тэмпераментна, дынамічна. Асабліва парадавала здольнасць (а за гэтым "тоны" прачытаных кніг) бачыць сваю нацыянальную культуру ў сусветным культуралагічным кантэксце, у святле найноўшых тэорый і тэндэнцый.

Свежа гучалі на пленарным пасяджэнні і зацікаўлена ўспрымаліся аўдыторыяй, дзе пераважалі студэнты-старшакурснікі, выступленні выкладчыка Белдзяржуніверсітэта **Т. Навагродскага** ("Праблемы і задачы беларускай этналогіі"), супрацоўніка Інстытута філасофіі НАН Беларусі **С. Санько** ("Традыцыя і дэканструкцыя"), выкладчыкаў БДПУ імя М. Танка **І. Вуглік** ("Традыцыйная культура і псіхатэрапія") і **Н. Здановіч** ("Фарміраванне традыцый вытворчасці дымленай і глянцавай керамікі на Беларусі").

Працавалі дзве секцыі: "Актуальныя праблемы фалькларыстыкі і этнаграфіі", на якой старшынствала кандыдат філалагічных навук **В. Сухая**, і "Фальклорныя традыцыі ў гісторыка-культурным працэсе" пад кіраўніцтвам ужо згаданага Аляксея Рагулі. Усяго тут было заяўлена звыш трыццаці выступленняў, і, зразумела, зрабіць нават іх беглы пераказ, а тым больш аналіз — немагчыма. Але матэрыялы канферэнцыі арганізатары мяркуюць выдаць асобнай кнігай, так што зацікаўленым чытач будзе мець магчымасць непасрэдна далучыцца да тых праблем, што былі ўзняты на гэтым прадстаўнічым форуме.

Апрача гэтага, у перапынку нас усіх парадавалі беларускія народныя песні ў набліжаным да аўтэнтычнасці выкананні. Хораша спявалі студэнткі **Алеся Белая** і **Аліна Дзямешка**, якія сёлета праходзілі фальклорную практыку пад кіраўніцтвам Валянціны Сухой і не толькі прывезлі шмат цікавых запісаў, але і самі арганічна засвоілі выканальніцкую манеру народных спявачак. Зусім верагодна, што дзяўчаты ўліюцца ў фальклорны гурт "Гуда", які існуе пры кафедры гісторыі і тэорыі культуры, спявачкі якога — **Вольга Карпцова** і **Вікторыя Міхно** выявілі сваё майстэрства, а мо лепш, уменне выконваць беларускі спеў у яго праўдзівай народнай манеры. А вось **Наталля Байдзіна** — сапраўдная прафесійная артыстка, выкананне якой вызначаецца яркай індывідуальнай адметнасцю.

Цікава ў жыцці бывае: пасля канферэнцыі я зайшоў у майстэрню свайго земляка і сябра Кастуся Качана. Пачаў расказваць пра толькі што атрыманыя ўражанні.

— Дык я ж іх ведаю! — усклікнуў Кастусь і дастаў з паліцы ладны стос папераў. Як выявілася, гэта былі рэцэнзіі-ўражанні студэнтаў другога курса музычна-педагагічнага факультэта, напісаныя імі пасля наведвання майстэрні, куды іх прыводзіла Наталля Байдзіна.

Далучаць маладое пакаленне да прыгажосці і дабрыні, да глыбінных каранёў сваёй нацыянальнай культуры, своеасаблівасць і багацце якой па-сапраўднаму можна адчуць толькі ў абсяжным сусветным кантэксце, — хіба гэта не высакародная мэта, якой ахвярна служыць калектыў, што адзначыў сваё дзесяцігоддзе. Няхай ім шчасціць на сонечнай дарозе ў будучыню.

Яўген ЛЕЦКА.

стасункі

ПЕРАКЛАД ЯК СРОДАК УЗАЕМАСУВЯЗІ ЛІТАРАТУР

У бібліятэцы Дома літаратараў адбыўся семінар перакладчыкаў з удзелам расійскіх і беларускіх пісьменнікаў, на якім прысутнічалі літаратары Вольга Іпатава, Уладзімір Саламаха, Лявон Баршчэўскі, Сяргей Законнікаў... Расію прадстаўлялі паэт Уладзімір Леванові (дарэчы, прамы нашчадак нашага Андрэя Александровіча) і галоўны рэдактар часопіса "Дружба народаў" Аляксандр Эбанаідзе. Да слова, згаданы часопіс сёння выконвае унікальную функцыю: друкуе ў перакладзе на рускую мову творы пісьменнікаў усёй постсавецкай прасторы, хоць і мае наклад усяго пяць тысяч экземпляраў. На яго старонках знайшлі месца новыя знаходкі Васіля Быкава, Святланы Алексіевіч, Алеся Разанава.

Амаль усе прысутныя выказвалі надзею, што работа семінара трансфармуецца ў "круглы стол", а ў недалёкай будучыні — у шырокую сустрэчу з аматарамі літаратуры, адбудзецца абмен творамі перакладчыкаў з Расіі і Беларусі.

Семінар працаваў два дні. У першы прысутныя мелі магчымасць азнаёміцца з дакладамі І. Чароты "Стан узаемасувязей суседніх літаратур", В. Рагойшы "Мастацкі пераклад у сістэме сучасных усходнеславянскіх літаратурных узаемасувязей", В. Стралко "Патрэбы і магчымасці ажыццяўлення беларуска-ўкраінскага і ўкраінска-беларускага паэтычнага перакладу".

Другі дзень семінара адкрыўся выступленнем нашага вядомага перакладчыка Лявона Баршчэўскага. Тэма яго даклада — "Пераклады скандынаўскай літаратуры ў Беларусі" — невыпадковая, бо Лявон Пятровіч — перакладчык без перабольшвання фенаменальны: дорыць беларускаму чытачу творы літаратур ажно 12 еўрапейскіх народаў, у тым ліку і славянскіх. На думку спадара Баршчэўскага, мы не маем права губляць стасункі, зразумела ж, і літаратурныя, з суседнімі краінамі, бо, напрыклад, з Літвой мы жылі ў адной дзяржаве 600 год, з Украінай — 700, з Польшчай — 225 (а Заходняя Беларусь крыху і болей), з Расіяй — 200. Прыклалі руку да стварэння дзяржаўнасці нашай краіны і скандынавы. Прынамсі так лічыць шведскі журналіст і пісьменнік Абрахамсан у сваёй кнізе "Беларусь: 89 мілімітраў ад Еўропы", што пабачыла свет некалькі год таму. Ён расказвае пра паходжанне полацкага князя Рагвалода — лічыць яго шведам Рангвальдам. Кніга Абрахамсана разышлася ў Стакгольме за два месяцы. Падобная з'ява — вельмі рэдкая.

Пераклады са скандынаўскіх літаратур актывізаваліся прыкладна ў 1986 годзе.

Спачатку кнігі скандынаўскіх аўтараў выходзілі ў нас у перакладах з рускай мовы. Толькі з канца 80-х гадоў на Беларусі сталі з'яўляцца пераклады з арыгіналаў, першапраходцам чаго стаў Якуб Лапатка, які пачаў з фінскай паэзіі, а потым перайшоў да прозы. Шведска-беларускія ж кантанты набылі новую дынаміку ў канцы 90-х гадоў.

Па словах Лявона Баршчэўскага, адкрытасць Беларусі — абавязковая ўмова і для літаратурнага развіцця. Мы не павінны забывацца, што належым да сярэднееўрапейскай культурнай прасторы. Галоўнае, клапаціцца пра чытача. Сёння на Беларусі перакладчыцкая сітуацыя складаная, і галоўная праблема тут — беларуская мова.

Напрыканцы свайго даклада Лявон Баршчэўскі прывёў некалькі лічбаў: зараз у Польшчы чатыры кафедры бедарусазнаўства, больш чым 100 школ, дзе вывучаецца беларуская мова як прадмет (у тым ліку два ліцэі); ёсць адпаведныя кафедры ў Літве, на Украіне. У Пражскім універсітэце чытаюцца лекцыі па беларусазнаўству, ёсць такія курсы ў Лондане, Нью-Йорку... Усё гэта — тая база, якая дазволіць мець плён перакладчыцкай справы на доўгія гады.

Алесь МЯСНІКОЎ.

да 120-годдзя песняра

МУЗЕЙ ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ

З верасня 1945 года ў Мінску адкрыта экспазіцыя Літаратурнага музея Янкі Купалы. Спачатку яна размяшчалася ў некалькіх пакоях Палаца культуры прафсаюзаў. Сучасны будынак музея ўзведзены ў 1960 годзе на месцы невялікага драўлянага домика, дзе Янка Купала жыў да 1941 года.

За гэты час у музеі пабывалі тысячы наведвальнікаў — паклоннікаў творчасці народнага паэта. Да юбілею песняра тут праводзяцца новыя цікавыя прэзентацыі, сустрэчы.

НА ЗДЫМКАХ: экспазіцыю музея Янкі Купалы аглядаюць вучні 167-й сярэдняй школы Мінска; адна са старэйшых супрацоўнікаў музея пляменніца паэта Ядвіга РАМАНОЎСКАЯ; кабінет Янкі Купалы — частка экспазіцыі.

Аляксандр ДЗІДЗЕВІЧ, БелТА.

каляндар-2002: студзень

* * *

17 студзеня спаўняецца 270 год з дня нараджэння **ПАНЯТОЎСКАГА Станіслава Аўгуста**, нарадзіўся ў цяперашнім Камянецкім раёне; памёр у 1798 годзе), апошняга караля Рэчы Паспалітай (1764—1875) і вялікага князя Літоўскага, асветніка, мецэната. Палітыка дзяржавы падчас яго праўлення была арыентавана на Расію.

* * *

20 студзеня ў засценку Мацюлішкі (Літва) нарадзіўся **Браніслаў ТАРАШКЕВІЧ** (памёр 29 лістапада 1938 года), грамадскі і палітычны дзеяч, вучоны-мовазнавец, пісьменнік, публіцыст, перакладчык, літаратуразнавец, акадэмік НАН Беларусі. Сучаснікам ён найбольш вядомы як аўтар "Беларускай граматыкі для школ", выдадзенай у 1918 годзе, якая адыграла сваю ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы і пашырэнні асветы на Беларусі, і перакладчык на беларускую мову "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча" і "Іліяды" Гамера.

— Заканчэнне на 8-й стар. —

прэзентацыя

РОЗНАБАКОВЫ ПАРТРЭТ

Імя беларускага кампазітара Міколы Равенскага вядомае ў свеце: ягоныя дыскі выходзілі ў Бельгіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Канадзе, Нямеччыне, а славуты гімн "Магутны Божа" на аднайменным фестывалі духоўных спеваў у Магілёве выконвалі артысты многіх краін.

Да 115-й гадавіны з дня нараджэння музыкі, якое 17 снежня 2001 года урачыста святкавалася не толькі ў Мінску, але і ў Лювэне (Бельгія), Парыжы (Францыя), Лондане (Канада) і іншых месцах, дзе пакінуў творчы і жыццёвы след Мікола Равенскі, упершыню на радзіме выйшаў у свет грунтоўны збор ягоных твораў на касетах і кампактдысках. Выданне стала важкім дадаткам да сур"ёзнай навуковай серыі "Беларускі музычны архіў", распачатай годам раней выпускам не менш унікальнага альбома "Ластаўкі ў стрэсе" знакамітага опернага тэнара Міхася Забэйды-Суміцкага.

Многія даследчыкі ўжо паспелі адзначыць сенсацыйнасць новага выдання. Для прыкладу: на дыску гучыць у выкананні таленавітай дачкі кампазітара Вольгі Аляксеенка (сапрана) маштабны раманс "Мой родны кут" на вершы Якуба Коласа, у якім пазнаюцца ноткі больш позняй апрацоўкі, дзе нават не згадвалася імя М. Равенскага.

Гучаць на дыску і фрагменты яшчэ адной "ахвяры" — гістарычнай оперы "Браніслава" (М. Равенскі — У. Дубоўка), а таксама неверагоднай эмацыянальнай моцы фартэпіянная сюіта, бліскуча выкананая выдатным сучасным піяністам Ігарам Алоўнікавым.

І ўсё ж дыск Міколы Равенскага нават з такімі рарытэтамі быў бы няпоўным без ягонага галоўнага гадаванца — Лювэнскага беларускага студэнцкага хору ў Бельгіі, з якім ён працаваў аж да самай смерці ў 1953 годзе. У рэпертуары хору былі і апрацоўкі беларускага фальклору, і творы самога Міколы Равенскага, і песні іншых супрацоўнікаў калектыву (напрыклад, піяніста і кампазітара Алеся Карповіча).

Калі некаму бянтэжыць памяць гэтае імя, дык нагадаю славуты раманс з рэпертуару Данчыка "Beloved". Яго напісаў менавіта Алесь Карповіч на вершы Сяржука Ясеня, эміграцыйнага беларускага паэта. А на дыску Міколы Равенскага твор выконвае Лювэнскі хор, дзе за фартэпіяна — сам Алесь Карповіч. Як і ў ягоным жа рамансе "І трэба ж было здарыцца".

Саліруе піяніст і ў "Лявонісе". Але гэта не тая "Лявоніха", што на першым CD "Беларускага музычнага архіва" (фальклор у апрацоўцы А. Туранкова). Лювэнскі хор узяў у рэпертуар лірыку Максіма Багдановіча з музыкай А. Туранкова. Кіраўнік хору Мікола Равенскі прагнуў больш жыццесцвярджальных, аптымістычных версій знакамітых мелодый сваёй Радзімы. Параўнайце:

А Лявоніха — не жонка была,
Немытую мне кашульку дала.
Немытую, не качаную,
У суседа пазычаную.

Гэта фальклор, гэта народная сатыра. Але ў Багдановіча гэты персанаж ажывае іншымі рысамі:

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая!
Ты пяяла галасней за салаўя,
Ты была заўсёды першай у танку —
І ў "Мяцеліцы", і ў "Юрцы", і ў "Бычку".
А калі ж ты жаці станеш свой загон,
Аж дзівуецца нядбайліца Лявон.

І не трэба шукаць супярэчлівасці ў гэтых версіях, проста нехта бачыць нядбайнага гаспадара, а іншы— вясёлую натуру.

Знакамітыя мелодыі Міколы Равенскага "Слуцкія ткачыхі" (на словы М. Багдановіча), "Такая ноч" (аднаўпеная паводле верша У. Дубоўкі самім М. Равенскім), "Не кувай ты, шэрая зязюля" (на верш М. Багдановіча), "Вясна" (на верш Я. Коласа) гучаць на новым CD у выкананні самых высакакласных беларускіх артыстаў розных часоў: тут і згаданы ўжо Лювэнскі хор ды оперны бас з Нью-Йорка Пётра Конюх, і сучасныя камерныя хары "Унія" і "Грайна", і выдатныя нашы оперныя салісты Віктар Скорабагатаў, Вольга Аляксеенка, Эма Пеніна.

Але самы знакаміты твор Міколы Равенскага — "Магутны Божа" на верш Н. Арсенневай — запісаны на дыску ў трох версіях.

На задавальненне В. Аляксеенка-Равенскай, выдаўцы распачалі праграму альбома з непаўторна ўзвышанага, урачыстага варыянта хору і аркестра Гродзенскай капэлы. Следам слухач патанае ў настроі аўтарскай версіі Лювэнскага хору, а потым на чатыры хвіліны яго зачароўвае магутны бас Пётры Конюха з нью-йоркскім казачым хорам пад кіраўніцтвам П. Жарава. І ўсё гэта — "Магутны Божа".

А наогул праграма дыска вельмі насычаная і працяглая — 79 хвілін, ён рознабаковы партрэт асобы славутага беларускага кампазітара.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

ЦІХІ НОНКАНФАРМІЗМ

Ціхі беларускі нонканфармізм... Гэта азначэнне, якое падалося не пазбаўленым філасофскага сэнсу, прыйшло якраз падчас працы над дакументальным фільмам пра Міколу Равенскага. Ён адданы быў беларускай музыцы і да вайны, калі аб'явілі нацдэмам, адно што арыштаваць і расстраляць не паспелі, і пасля вайны, калі воляю лёсу закінуты быў на чужыну. Колькі навалаў перажыў ён, як і ўсе беларусы, але не збочыў, застаўся сапраўдным сынам сваёй зямлі. Не ў адкрытым змаганні, не гвалтам (бо ад гвалту беларус стаміўся за стагоддзі сваёй гісторыі), а ціха, зацята трымаючыся свайго. Адсюль і нонканфармізм якраз беларускі, акурат ціхі.

Дзе вытокі яго? Як і ва ўсіх нас — у дзяцінстве, калі з калыскі далучаешся да роднага слова, дзе гарчаць недаспеласцю спакусныя яблыкі, дзе ляціць у неба цэркаўка, праз якую дакранаешся да высокіх напеваў. Беларусі ніколі не давалі спакою. У натуральны крутабег жыцця — народзіны, хрышчэнне, радзіма, бацька і маці, мова, песня, што ідзе ад душы народнай, — заўсёды няўмольна ўмешвалася гісторыя. Лёс чалавека, уплецены ў жорсткасць рэчаіснасці, станавіўся драматычным. А лёс музыкі асаблівы, бо, як ніхто, чуе яна дысгармонію часу, што ўрываецца ў спрадвечныя рытмы, крышыць усё на сваім шляху, выкручвае заведзены парадак.

Нарадзіўся Мікола Равенскі 5(17) снежня 1886 года ў вёсцы Капланцы Ігуменскага павета Мінскай губерні. Цяпер Бярэзінскі раён. Усяго на чатыры гады маладзейшы за нашых песняроў Якуба Коласа і Янку Купалу. Пра дарэвалюцыйны перыяд жыцця вядома няшмат, толькі што ў 1913-1915 гадах Равенскі вучыўся на рэгенцкіх курсах у Маскве і Пецярбургу. Пасля працаваў рэгентам і настаўнікам спеваў у Наваградку, збіраў народныя песні. Ужо тады пра яго можна было гаварыць як пра фалькларыста, кампазітара і хормайстра. Гай Пікарда лічыць, што ў гэты перыяд напісана значная частка яго твораў.

У Мінск Мікола Равенскі трапляе ў 1919 годзе. Кіруе хорам пры Беларускім рабочым клубе, працуе хормайстрам БДТ (цяперашні Купалаўскі тэатр). У 1921 годзе бярэ ўдзел у фальклорнай экспедыцыі па Случчыне, арганізаванай Інбелкультам. Мінскае кааперацыйна-выдавецкае таварыства "Адраджэнне" ў 1922 годзе выпускае "Зборнік песень з нотамі" М. Равенскага. Цікавая гісторыя гэтага спеўніка. Яго не адшукаеш сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы. Скралі зацікаўленыя людзі, калегі. І не толькі самую кнігу, скрадвалі мелодыі, матывы кампазітара, выдаючы іх за свае. Як, напрыклад, "Мой родны кут". Вядома, знік кампазітар пасля вайны, на чужыне апынуўся. Чаму б не скарыстацца? Пра такія выпадкі ведае дачка кампазітара Вольга Аляксеенка. Я не буду тут сцвярджаць безапеляцыйна. Думаецца, што музыказнаўцы ўсё ж павінны сказаць праўду (зборнік увогуле існуе, ёсць у Лондане). А ў Беларусі гэты зборнік захаваў пісьменнік В. Вітка, і цяпер ён знаходзіцца ў дачкі кампазітара.

Бог суддзя плагіятарам, таленавітага майстра ад гэтага не паменшае, хутчэй, наадварот. Адно ведаю дакладна: пад нумарам 25 значыцца песня на словы Канстанцыі Буйло "Люблю наш край, старонку гэту", якую цягам шматлікіх дзесяцігоддзяў нам прадстаўлялі як народную. Аўтарка слоў радавалася такому факту, думаецца, што і Равенскі разумеў вышыню адзнакі кампазітарскай працы, калі песня робіцца народнаю.

Таленавітага сялянскага сына (хаця ўзрост сталы — 37 гадоў) як дзяржаўнага стыпендыята рэспублікі пасылаюць на вучобу ў Маскву. Цікавы факт: ад урада БССР пры гэтым ён атрымаў у падарунак унікальную скрыпку. Трэба думаць, што інструмент быў дарэвалюцыйнай работы, выраблены выдатным майстрам. З гэтаю скрыпкаю Мікола Равенскі не расставаўся трыццаць гадоў, да самай смерці. У ліхія гадзіны, як на пачатку акупацыі ці на чужыне, яна была яго адзіным найбольшым набыткам-"манаткам". Яскрава ўяўляецца, як у супаддзі з сяброўкай-скрыпкай нараджалася мелодыя неўміручага "Магутнага Божа" на словы Наталлі Арсенневай. Было тое вясной-летам 1947 года ў далёкім Остэргофэне. Равенскі жыў у адной кватэры з бацькамі Зоры Кіпель.

Але да гэтага шлях быў яшчэ далёкі. Маскоўскі перыяд жыцця кампазітара ахоплівае гады з 1923-га па 1930-ты. Спачатку закончыў музычны тэхнікум імя Стасава, пасля Маскоўскую кансерваторыю. Быў вучнем Міхаіла Іпалітава-Іванава, які ў першай палове 20-х гадоў узначальваў Беларускую песенную камісію. Жыў Мікола Якубавіч на Малой Мікіцкай вуліцы ў будынку прадстаўніцтва БССР. І тут арганізаваў зямляцкі хор. Адсюль і ягоныя шчырыя стасункі з Уладзімірам Дубоўкам, які, трэба меркаваць, жыў таксама ў беларускім будынку. Кампазітара і таленавітага паэта падзялялі чатырнаццаць гадоў розніцы ва ўзросце, але якраз маладзейшы значна паўплываў на творчасць старэйшага. Равенскі напісаў песні на вершы Дубоўкі "О Беларусь, мая шыпшына", "Такая ноч" (адна з найлепшых рэчаў), "Ліпнёвы гімн", які пасля арышту Дубоўкі ў 30-м годзе быў забаронены. Тады ж канфіскавана была і першая беларуская гістарычная опера "Браніслава", таксама плён супрацоўніцтва з Дубоўкам. Мікола Равенскі першым паклаў на музыку вершы Максіма Багдановіча "Слуцкія ткачыхі", "Завіруха", "Не кувай ты, шэрая зязюля". Ужо ў час вайны напісаў музыку да "Пагоні". З даваеннага плёну яшчэ шматлікія апрацоўкі народных песняў, гістарычная сюіта па матывах аднайменнага верша Буйло "Курган", першая беларуская аперэта "Залёты" на словы Дуніна-Марцінкевіча, песня на словы Цішкі Гартнага "Ах ты, Нёман-рака". Яна таксама лічылася народнаю, гучала па радыё, яе здаўна выконваў мікалаеўскі ансамбль "Коласаўскія землякі" майго стрыечнага дзядзькі Міхала. Твор і сёння для іх народны.

Пасля Маскоўскай кансерваторыі ў 1930 годзе Мікола Равенскі вяртаецца ў Мінск, выкладае ў музычным тэхнікуме, а пазней у новаствоpанай Беларускай кансерваторыі. Але ўжо прыклеены да яго ярлык: нацдэм. Найперш за сяброўства і творчае супрацоўніцтва з Уладзімірам Дубоўкам. Ды не толькі. У 1938 годзе арыштаваны і расстраляны ў Курапатах старэйшы брат Антон, які настаўнічаў у Карзюках недалёка ад Мінска. Пасля вучобы Мікола летнія вакацыі праводзіў у брата і потым бываў неаднойчы. Загінуў у Курапатах і стрыечны брат Аляксандр. Самога Міколу Равенскага ў 1938 годзе выключаюць з Саюза кампазітараў, знаёмыя сталі адварочвацца. Творца вымушана адышоў у цень.

Мікола Равенскі ціха і зацята трымаўся нонканфармізму. Як да вайны, так і ў вайну...

Першая жонка Міколы Якубавіча памерла ад родавай гарачкі, пакінуўшы дачку Лёлю (Лену). У час вайны дачка стала падпольшчыцай пад кліччкай "Сініца". Жыла з Ісаем Казінцом, сябравала з Людмілай Кашачкінай. Усе трое трапілі ў гестапа, выжыла толькі Кашачкіна. Лёлю расстралялі ў двары мінскай турмы. Равенскі колькі разоў заходзіў да дачкі на Берсана, 12. Падрастаў унук Барыс.

Перад вайною кампазітар ажаніўся другі раз, яго абранніцай стала ўласная вучаніца Яніна, маладая спявачка. Ад яе нарадзіліся дзве дачкі, адна (Люда) памерла малым дзіцем. Яніна Станіславаўна з дачкой Вольгай пад акупацыяй жылі гаротна, муж і бацька не мог іх знайсці, дапамагчы, забраць да сябе ў Ігумань. Зазірнуўшы наперад, адзначым, што кар'ера маладой таленавітай спявачкі Яніны Станіславаўны не адбылася па вядомых прычынах: жыццё пад акупацыяй, муж-эмігрант. З цяжкасцю, але выцерабілася на бацькаву сцяжыну Вольга Мікалаеўна. Скончыла кансерваторыю, спявала ў хоры Віктара Роўды. Дарэчы, калі ансамбль стаў выконваць "Магутны Божа", спачатку не ведала, што ўрачыстую духоўную песню напісаў яе бацька. Цяпер актыўнейшая прапагандыстка творчасці Равенскага, выконвае шмат якія ягоныя творы.

У 1950 годзе Міколу Равенскага запрашаюць у бельгійскі Лювэн, дзе стала магчымым студыявацца ў мясцовым універсітэце трыццаці маладым беларусам. Гэта апошняя старонка жыцця кампазітара. У Лювэне з ліку навучэнцаў ён стварае Беларускі студэнцкі хор, прапагандуе народную музыку. Гэта была адзінаддушына немаладога і ўжо незваротна хворага майстра ад тугі па радзіме. Можна толькі здзіўляцца, як з выпадковых для музыкі людзей яму ўдалося стварыць высокамастацкі ансамбль. Тут, акрамя дасканалага пачуцця харавога стылю, патрэбна была надзвычайная ўпартасць і цярплівасць у працы. Але гэта ўдалося! Папулярнасць хору выйшла далёка за межы Бельгіі, беларускую песню слухалі ў Парыжы, Лондане ды іншых кутках Еўропы. Штрышок аб тым часе даюць словы Равенскага з ліста ад 10 студзеня 1952 года ў Англію да сваячкі Таццяны (Тэрэзы) Руткоўскай, дачкі згаданага стрыечнага брата Аляксандра: "*...Прыступіў да працы, у сучасны момант рыхтуемся да напяяньня грамафонных плітак. Маем шэсць пліткаў, на якіх будзе зьмешчана 12 песьняў. Больш пакуль не зможам напець, бо вельмі дорага каштуе. Дагаворы з фабрыкай яшчэ не закончаны, за гэтыя пліткі яна патрабуе дзевяцьсот тысячаў, але, думаю, пойдзе "на ўступкі"*.

• Пашчасціла слухаць народныя песні з тых кружэлак. Высокае духоўнае гучанне, адразу адчуваецца класічны прафесіяналізм. Сам не музыказнаўца, таму для ацэнкі творчасці дамо слова калегу Равенскага, таксама кампазітару-эмігранту, музычнаму крытыку і яго таварышу Алесю Карповічу: "*Праз усе творы, пры*

ўсёй іхнай эмацыянальнай разнастайнасці і шырокім жанравым дыяпазоне чырвонай ніткаю праходзіць прынцып беларускасці ў музыцы... Ягоная любасьць да народных мэлёдыяў, імкненьне захаваць усю таямніцу прыгажосьці й багацьця выразу гэтага мэлясу, не пераабцяжыць яго гарманічнымі або тэмбровымі колерамі"...

Людзі, якія ведалі Равенскага, адзначалі яго шчырасць, пагоднасць, сардэчнасць, гасціннасць, гатоўнасць кожнаму дапамагчы. Яшчэ адзін чапавечы штрышок з успамінаў У. Немановіча (Уладзіміра Цвіркі): "*Бывала, пастукаеш да яго: — Гм, — адказваў глыбачэзны бас з-за дзвярэй. З-пад стала, закіданага нотнай паперай, на вас глядзелі ветлыя шэрыя вочы. — А пропуск ёсць? — пытаўся ён паважна. Пропускам зваў ён жартаўліва віно, што было звычайна люксусам не па студэнцкай кішэні. Гэта ён ведаў, але хоць на жарт, ад "традыцыйнае" формы прывітаньня не адступаў*".

Памёр Мікола Равенскі 3 сакавіка 1953 года, пахаваны ў Лювэне. У ягоным пакоі на стале ляжаў лісток календара, дзе побач з запісанымі тэмамі да песняў была зроблена рукою кампазітара рысункавая кампазіцыя: па-мастацку накрэсленыя альфа і амега, а пасярод — слова "Беларусь". Яшчэ адзін знак нонканфармізму, калі апеляваць да назвы гэтага аповеду. Жыў і тварыў мастак дзеля Беларусі і яе народа, дзеля духоўнай прыгажосці — таму і песня яго засталася арліна-свабоднаю, крыштальна чыстаю, вечна маладою.

Помнік на магіле зрабіў скульптар Міхась Наўмовіч, яшчэ адзін беларус-эмігрант, які жыве ў Парыжы. Спадчыну падзялілі паміж беларускай абшчынай і пляменніцай кампазітара Таццянай Руткоўскай. Але дзялілі "пабеларуску": найбольш каштоўныя рукапісы кожны цягнуў сабе. Таму і цяжка сёння сабраць усё ў адно. "Завілася, як дым", калі скарыстаць словы Міколы Якубавіча, і знакамітая скрыпка, нехта са сваіх прыбраў да рук. Адшукаць бы яе ды вярнуць у Беларусь, каб стала нацыянальным набыткам.

У Масея Сяднёва ёсць верш "Сьмерць музыкі. Памяці Міколы Равенскага" з такімі шчымлівымі радкамі:

Баюся я ўжо — на зямлі зусім
зьвядуцца песьняры і гордыя
музыкі.
Ды што я гавару — чужога места
завулкі-вуліцы й мяне забудуць,
дармо, што я хадзіў па іх
задумны і натхненны...

Прарочыя словы, што тычыцца гарадоў чужынскіх. Прарочымі яны былі на працягу дзесяцігоддзяў і для гарадоў Айчыны. Дзякаваць Богу, не назаўсёды. Вярнуўся сам паэт, вярнуўся творамі кампазітар. Пачалося гэта з канца 80-х. У выкананні розных калектываў загучаў "Магутны Божа", неаспрэчны духоўны гімн беларусаў. Нават калі б Мікола Равенскі больш нічога і не напісаў, ён адной гэтай урачыстай песняй застаўся б ва ўдзячнай памяці нашчадкаў, застаўся назаўсёды з намі. Былі публікацыі, хоць і нешматлікія. У 1993 годзе на студыі "Летапіс" кінастудыі "Беларусьфільм" створана дакументальная стужка "Успамін пра Міколу Равенскага", аўтарам сцэнарыя якой выпаў гонар мне быць. Гэты фільм у ліку трох стужак рэжысёра Міхаіла Жданоўскага (яшчэ "Дарога на Курапаты" і "Жаўрукі Беларусі") адзначана годам пазней Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

І вось да 115-й гадавіны з дня нараджэння ў Беларускім музычным архіве выпушчаны кампакт-дыск "Магутны Божа" з лепшымі творамі Міколы Равенскага. Стане ён рарытэтам у маёй хатняй фанатэцы, як і ў многіх беларускіх сем'ях.

Уладзімір МАРОЗ, кінадраматург.

г. Мінск.

спадчына

МАЛЯВАНЫ ДЫВАН — РАСКВЕЧАНЫ КВАДРАТ МАЛЕВІЧА

Фота Тацяны ГАРАНСКАЙ.

Беларусь — бадай, адзіная ў свеце краіна, якая мае унікальны збор маляваных дываноў, гэтага адметнага віду народнага мастацтва. Самая вялікая калекцыя — больш за 150 твораў — знаходзіцца ў гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Заслаўе". Тут сярод экспанатаў народных майстроў, сабраных з розных куточкаў, захоўваюцца дываны знакамітай Алены Кіж, у свой час адшуканыя Уладзімірам Басалыгам, 30 палотнаў пэндзля Язэпа Драздовіча, а таксама нашых сучаснікаў Віктара Маркаўца ды Аляксея Марачкіна, якія сёння працягваюць традыцыю маляванак, што бярэ свой пачатак ажно ў XVII стагоддзі. У 1978 годзе якраз намаганнямі гэтых і іншых мастакоў была наладжана першая выстава маляваных дываноў, аснову экспазіцыі якой склалі іхнія зборы.

А напрыканцы мінулага года адбыўся Першы пленэр маляванага дывана як сведчанне развіцця і жывучасці народнай творчасці. Яго ладзіла Асацыяцыя творчых жанчын пад кіраўніцтвам Таццяны Гаранскай, якой і належыць ідэя гэтай мастакоўскай акцыі. Узнікла яна неяк спантанна, падчас выставы твораў жывапісу беларускай мастачкі Галіны Русак, якія яна падаравала заслаўскаму музею. Нягледзячы на тое, што яе творчасць фармавалася на чужыне, у далёкай ад роднай Бацькаўшчыны Амерыцы, шматлікія працы мастачкі прасякнуты народнымі матывамі. Менавіта гэтая акалічнасць і стала падставай для таго, каб Першы пленэр маляванага дывана прысвяціць памяці нашай суайчыннікі Галіны Русак.

На Пакровы ў старажытным Заслаўі ля касцёла Нараджэння Дзевы Марыі сабраліся ўдзельнікі акцыі. Сярод іх — школьнікі, натхнёныя сваёй настаўніцай Людмілай Галубец, студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў, заслаўскія аматары народнай творчасці ды прафесійныя мастакі. Дзея адбывалася навідавоку ў людзей. Жыхары мястэчка мелі шчасце назіраць, як удзельнікі пленэру на працягу пяці гадзін шчыравалі над палотнамі, пафарбаванымі начорна і прымацаванымі да драўлянага плота вакол касцёла. На вачах адбываўся сапраўдны цуд. Трыццаць шэсць твораў (а менавіта столькі было ўдзельнікаў) расквецілі разнакопернымі фарбамі шэры касцельны плот. Здавалася, што ты трапіў у фантастычную беларускую казку, якая нечакана адкрыла свае духоўныя скарбы.

Вынікам гэтага незвычайнага пленэру сталася выстава і канферэнцыя на тэму "Маляваны дыван у прасторы сучаснай культуры", якія адбыліся ў Заслаўскай музычнай школе. Пры адкрыцці выставы доктар мастацтвазнаўства Яўген Сахута прыгадаў першую экспазіцыю народных маляванак у сталічным Палацы мастацтва 23 гады таму і адзначыў, што гэта было сапраўднае адкрыццё, якое паклала пачатак вяртанню забытага віду народнага мастацтва і фактычна выйшла за рамкі мастацтвазнаўства і музеязнаўства. Пра гэта сведчыць і першы пленэр, і першая навукова-практычная канферэнцыя.

Незвычайным быў склад дакладчыкаў, што выступілі на ёй. Акрамя навукоўцаў, у канферэнцыі бралі ўдзел мастакі і студэнт БелАМ Яўген Білей — усяго 14 удзельнікаў. Цікавы погляд на з'яву маляванага дывана як унікальнага віду мастацтва выказаў Віктар Маркавец, які параўнаў маляваны дыван з чорным квадратам Казіміра Малевіча, распісаным народным майстрам. Гэтую думку прадоўжыў Аляксей Марачкін. Пры гэтым ён дадаў, што маляваны дыван як зорнае неба, расквечанае ўзорамі ды кветкамі роднага краю.

У імпрэзе бралі ўдзел Яўген Шунейка, Марына Ісаёнак, Святлана Каткова, Маргарыта Шчамялёва, Ніна Сокалава-Кубай, Юры Малаш, Мая Кляшторная. Было выказана пажаданне, каб такія пленэры былі традыцыйнымі, а Заслаўскі музей-запаведнік стаў цэнтрам адраджэння і развіцця мастацтва маляванага дывана.

Ірына ЛЯКСЕЕВА.

гісторыка-публіцыстычнае эсэ

...І НЕ БЫЛО ЗАЎТРА

Аляксандр АЛПЕЕЎ

У Кольна ў пачатку мінулага стагоддзя жыло 760 чалавек, сярод іх 76 дзяцей. Рудня была падобнай на блізкую вёску Грэбень, што ўсяго за тры кіламетры: прыкладна такая ж колькасць насельніцтва, і ўмовы жыцця падобныя. А жыццё было, як заўсёды ў сялян, не "цукар". Вось што ўспамінаў стары жыхар Грэбеня І. Ф. Гулюта: "*У нашай сям'і было дзесяць душ. А зямлі — менш дзвюх дзесяцін. Была, праўда, карова, але лепш бы яе не было зусім: дзесяць дзён у месяц бацька павінен быў адпрацоўваць памешчыку ў Буйкавічах за тое, што карова пасвілася на яго лузе. Але як дзецям без малака?.. Не заўсёды быў і кавалак хлеба на стале. Бацька надрываўся на сваёй і на панскай рабоце, таму і пражыў нядоўга. У пачатку стагоддзя ў Грэбені было два-тры дзесяткі двароў, а пахаванні амаль кожны дзень. Асабліва часта паміралі дзеці, якіх у сялянскіх сем'ях было памногу... У памешчыкаў Кеневіча і Левандоўскага ўгоддзі — не акінуць вокам. Забягуць дзеці ў панскі лес, сарвуць ягаду — штраф, калі заўважыць аб'ездчык. Зойдзе карова на луг — штраф. За грыбы, што збіралі людзі ў лесе, таксама трэба было плаціць*"...

Дрэнна, здавалася б, вельмі дрэнна, бедна, холадна і голадна жылося мужыку. Не было прасвету пад маральным і матэрыяльным прыгнётам... Зразумела, не соладка, ніхто не можа сцвярджаць, што жыццё селяніна было бясхмарным. Аднак усё пазнаецца ў параўнанні: сапраўднае пекла пачалося пазней, у канцы 20—30-х гадоў, калі размах набрала суцэльная калектывізацыя, пачаліся масавыя арышты, "чорны воран" распасцёр крылы над краінай... А тады, да рэвалюцыі, мужык, наняты да памешчыка на касьбу, атрымліваў у дзень 80 капеек — 1 рубель, жняя — 50 капеек. Патрабавалі ж адпаведна 1 рубель 50 капеек — рубель, не выходзілі на работу ў самы сезон, і патрабаванні рабочых у большасці выпадкаў задавальняліся. За два-тры дні работы касец мог зарабіць сабе на боты, за тыдзень, працуючы ўдваіх з жонкай, — купіць карову, якая каштавала не больш 10 рублёў.

У Рудні і навакольных вёсках людзям жылося, магчыма, лягчэй. Зразумела, як і ўсюды, даводзілася гнуць спіну з раніцы да вечара на сваёй зямлі — калі яна была, а ўдосталь зямлі не было практычна ні ў кога. Кожная шостая гаспадарка, згодна са статыстычнымі звесткамі губернскага зямельнага ўпраўлення Паўночна-Заходняга краю, была без коней, восем працэнтаў сем'яў не мелі зямлі і вымушаны былі наймацца на заработкі да памешчыкаў і больш багатых сялян, папаўняючы армію пралетарыяту ў гарадах. Як бачым, працэнт беззямельных беднякоў быў не такі вялікі. Галоўнай бядой сялянскіх сем'яў была неабходнасць дзяліць свае кавалкі зямлі на сыноў, тыя, у сваю чаргу, — на сваіх, і ў выніку ўжо няма чаго дзяліць, а жыць трэба... Не дарэмна прэм'ер-міністр Расіі П. Сталыпін пасля бясслаўнай руска-японскай вайны рашыў зрабіць стаўку на хутарскую сістэму — выдзяленне сялянам на льготных умовах нязручных для ворыва зямель і высяленне іх на хутары.

Многія сяляне з Рудні, галоўным чынам, маладыя, ішлі ў парабкі да заможных сялян, да памешчыкаў Левандоўскіх у суседнія Буйкавічы ці наймаліся на сезонныя работы. Гэта была ўзорна-паказальная па тых часах гаспадарка. Работы вяліся па ўсіх правілах агратэхнікі, пабудаваны добрыя памяшканні, дзейнічаў вінакурны завод № 160, каштоўнасць памяшканняў і абсталявання якога складала 7 000 рублёў, а таксама млын, вялікі сад.

У канцы пазамінулага стагоддзя край інтэнсіўна асвойваўся. У 70-я гады будавалася Палеская чыгунка, рэйкі якой праляглі недалёка ад Рудні, праз Жыткавічы, і паслужылі хуткаму росту мястэчка. Многія руднянцы ўдзельнічалі ў гэтых работах — узводзілі насыпы, укладвалі рэйкі. Паэт М. Някрасаў апісваў у вершы "Железная дорога" будаўніцтва іншай, Пецярбургскай дарогі, але ўмовы работы землякопаў былі, зразумела, аднолькавыя, і радкі: "Видишь, стоит, изможден лихорадкою, высокорослый, больной белорус" у поўнай меры можна аднесці да будаўніцтва Палескай чыгункі, і беларус, магчыма, гэта селянін з Рудні. Тым больш, што гэта дарога была пабудавана за вельмі кароткі час: у адрозненне ад шырока вядомага ў свой час БАМа, які і да гэтай пары не закончаны, падрыхтоўчыя работы па будаўніцтву Палескай чыгункі пачаліся вясной 1883 года, а першы поезд у Жыткавічы прыйшоў 15 лютага 1886 года. Гудок паравоза ў гэты дзень пачулі, зразумела ж, і жыхары Рудні.

Працавала экспедыцыя генерала І. Жылінскага па асушэнні палескіх балот — каналы, выкананыя ўручную, рыдлёўкамі рабочых-землякопаў, у асноўным захаваліся і да сённяшняга дня, прыносяць істотную карысць. Ішлі інтэнсіўныя лесараспрацоўкі. Усюды патрабаваліся рабочыя рукі. Жыццё сялян Рудні мала чым адрозніваласа ад жыцця іншых беларускіх вёсак і паселішчаў.

Але наступіў 1917 год, які прынёс карэнныя, глабальныя змены.

Землі ў ваколіцах Рудні малаўрадлівыя, у асноўным пясчаныя, аднак магчы пракарміць селяніна, калі ён чалавек працавіты. Жыхары Рудні прывыклі да свабоды. Нават сялянскія хаты ў вёсцы раскіданы часта адвольна, не прытрымліваючыся строга вуліц.

Мінулае Тураўшчыны багатае не толькі гісторыяй, але і таленавітымі асобамі. Што значыць для культуры ўсёй Беларусі Кірыл Тураўскі — вялікі асветнік, літаратар, епіскап! Можна ўспомніць святых Барыса і Глеба, свяціцеляў Лаўрэнція і Марціна. Жыў і ўладарыў на Тураўшчыне Канстанцін Астрожскі... Таленты, як правіла, нараджаюцца ў правінцыі, у глыбінцы, на вёсцы. Абодва нашы беларускія касманаўты, амаль кожны пісьменнік, паэт, мастак, большасць палітычных дзеячаў і гаспадарлівых кіраўнікоў — сяльчане.

Працяг. Пачатак у № 2.

дзіцячая чытанка

СТУДЗЕНЬ — ГОДУ ПАЧАТАК

І лягла ж цішына
У бары за гарой, —
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

Снег пушаны залёг
На галінках сасон,
І чарнобель, і мох
Атуліў сабой ён.

Янка КУПАЛА.

"Студзень — году пачатак, зіме сярэдзіна", — гавораць у народзе. І сапраўды: зіма ў разгары, маразы мацнеюць з кожным днём, снег сыпле і сыпле, усё шчыльней укрываючы сонную зямлю суцэльным белым покрывам.

І не пазнаць ужо ранішняга лесу. Увесь срэбным інеем укрыты: кожная галінка, кожная хваёвая лапка ў пышным белым убранні ды іскрыцца ў першых промнях рыжага сонца бясконцым мноствам зорачак, нібы добры чараўнік развесіў усюды цудоўныя карункі, прыхарашыў іх непаўторнымі смарагдамі. Якая прыгажосць!

...А лёгкая начная пароша выдае лясных жыхароў. Вось напятлялі ўзад і ўперад на лясной палянцы зайцы-белякі. Сляды беляка больш буйныя і круглыя, чым у русака, хоць ён сам і меншы. Лапы ў яго шырокія, а да зімы яшчэ моцна абраслі густой шчыльнай поўсцю. Ідзе бяляк па снезе, як у шырокіх валёнках ці на лыжах. А вось роўненькі, як пад лінейку, акуратны, сярэдняй велічыні след: не спяшаючыся, ішла на паляванне лісіца. А непадалёку — ланцужок слядоў, снег у асобных месцах раскапаны, побач раскіданыя шкарлупінкі вылушчаных арэхаў. Спускалася на зямлю ў пошуках сваіх кладовак вавёрка.

А гэта што такое? Сапраўдная звонкая песенька чуецца ў зімовым лесе? Спяваюць жа птушкі толькі ў перыяд выседжвання птушанят. Так яно і ёсць. Гэта крыжадзюб — адзіная птушка нашых лясоў, якая выводзіць птушанят у самыя моцныя маразы. Заліваецца песнямі каля свайго гнязда — невялікая, крыху большая за вераб'я, з зеленаватым адлівам — сапраўдная жывая цацка на яловай галінцы. Гняздо крыжадзюба надзейна схавана ад сцюжы і ветру ў гушчыні яловых лапак. Сценкі гнязда тоўстыя, добра ўцепленыя. Што яму мароз! А корму для крыжадзюбаў вакол хапае. Як сапраўдны майстар, ён лушчыць яловыя і хваёвыя шышкі сваёй закручанай крыж-накрыж дзюбай! А насенне такое пахучае, смалістае, багатае на бялкі і вітаміны. Як на дражджах расце крыжадзюбава патомства.

У лясным гушчары, пад старым выварагнем, з'явілася ў прасторным берлагу патомства і ў бурай мядзведзіцы — трое маленькіх сляпых камячкоў-мядзведзянят з рукавічку велічынёй. Куды ж тут быць большымі: малака ў маці да вясны не хапіла б, яна ж зімой не харчуецца, жыве за кошт назапашанага за лета падскурнага тлушчу.

Зіма ёсць зіма. Цяжка даводзіцца ў гэтую пару лясным жыхарам, а галоўнае — корму мала. Капаюць капытамі снег у пошуках леташняй травы алені і казулі, горнуцца да жылля чалавека сінічкі і снегіры — кожны прыстасоўваецца як можа. І абавязак чалавека — дапамагчы зімой дзікім жывёлінам і птушкам: у лесе раскладваюць сена і зернеадходы, развешваюць нарыхтаваныя ўлетку ліставыя венікі, дзеці майструюць каля сваіх вокнаў кармушкі для птушак.

Вячаслаў СТОМА.

стоп-кадр

Калядныя гулянні ў Траецкім прадмесці Мінска.

ЯК ЗВЯРЫ Ў ЛЕСЕ КАЛЯДЫ АДЗНАЧАЛІ...

Ідзе Ліса па лесе, а насустрач ёй Воўк. Павіталіся, і Ліса гаворыць:

— Вось Каляды хутка, як адзначаць будзем?

— Я звычайна выццём адзначаю, — адказвае Воўк.

— Куды гэта варта: тут весяліцца трэба, а ты тугу наганяць сабраўся.

— А што ты прапануеш?

Ліса паглядзела па баках, бачыць: на бярозе Сарока сядзіць.

— Прывітанне, белабокая! Злётай ты да Аленя і скажы, каб збор трубіў, параіцца трэба.

Сабраліся звяры на вялікай паляне і сталі раіцца, як лепш Каляды адзначыць. Хтосьці і аб падарунках пад ёлачку для дзетак-зверанят успомніў. А дзе іх узяць? Тут Ліса і прапанавала:

— Трэба да Лесавіка ісці, без яго мудрай парады нам не абысціся.

І як ні шкада было трывожыць старога, пастукаліся ў вялікае дупластае дрэва. Адразу з дупла верны ахоўнік Пугач выглянуў, а потым і Лесавік паказаўся. Выслухаў звяроў, трохі падумаў, пачухаў патыліцу і кажа:

— Ёсць у мяне адна добрая ідэя. Будуць ісці да дзетак у горад Дзед Мароз і Снягурка, прысядуць на пень адпачыць, і тут момант упускаць не трэба: хай Ліса падкрадзецца ціхутка і ў мяшку з падарункамі дзірку прагрызе. А каб Дзед Мароз са Снягуркай не пачулі, няхай Сарока грамчэй непадалёку трашчыць. І не хвалюйцеся, што дзеткам у горадзе мала падарункаў застанецца, бо свет гэты не без казачных дзівосаў...

Так і зрабілі. Дзед Мароз са Снягуркай, трохі адпачыўшы, падняліся з пня. Ідуць і з-за завеі не бачаць, што падарункі па аднаму на снег выпадаюць. Толькі за пагоркам схаваліся — звяры кінуліся збіраць іх, пакуль снегам не замяло.

Калі Дзед Мароз адчуў, што ноша яго вельмі палягчэла, спыніўся, паглядзеў на мяшок і адразу аб усім здагадаўся. Аднак злавацца не стаў, толькі ў бараду сабе ўсміхнуўся і завею ўзмахам посаха спыніў. А тут і сонейка выглянула. Узяла Снягурка праменьчык і дзірку ў мяху ім зашыла. А Дзед Мароз нахіліўся, прамовіў нейкія аднаму яму вядомыя словы — і мяшок зноў падарункамі напоўніўся.

А звяры сталі вырашаць, хто з іх мог бы лепш ролю Дзеда Мароза сыграць, каб сваіх дзетак пацешыць. Пагадзіліся, што найбольш удала гэта ў Мядзведзя атрымацца можа. Як ні шкада ім было касапага будзіць, сталі ў бярлогу да яго стукацца. Мядзведзь пабурчаў, паварочаўся з боку на бок ды няма чаго рабіць: падняўся, бараду з шэрага моху зладкаваў, посах узяў і да сваіх лясных суседзяў выйшаў. Ды яшчэ і мёду з медавухай прыхапіў.

І ўсе стараліся, як маглі: тут і арэхі, і грыбы, і варэнні-сапенні розныя стол упрыгожылі. А карагод павялі вакол елкі, што расла каля жытла Лесавіка, каб і ён мог парадавацца, а потым і да святочнага стала свайго дабрадзея запрасілі.

Станіслаў ВАЛОДЗЬКА.

крыжаванка

1. Гультай, лежабок. 2. Дошка або бервяно, пакладзеныя з берага на бераг для пераходу. 3. Ізаляваная камера спецыяльнага прызначэння на караблі, самалёце. 4. Дзеянне, учынак. 5. Верхняя частка дрэва ў сукупнасці ўсіх яе галін. 6. Круглая пляцоўка ў цырку для выступленняў. 7. Узяцце пад варту, пазбаўленне волі. 8. Пахавальны і памінальны абрад, памінкі па нябожчыку. 9. Новая, нядаўна набытая рэч (звычайна пра вопратку). 10. Парода дужых сабак, якіх выкарыстоўваюць для аховы жывёлы на пашах, для каравульнай службы. 11. Кароўнік. 12. Знявага, незаслужанае ўніжэнне. 13. Рад сумежных арак, якія апіраюцца на слупы або калоны і ўтвараюць звычайна адкрытую галерэю ўздоўж будынка. 14. Пра кавалак абпаленага, абгарэлага дрэва. 15. Рэчы, звязаныя ў посцілку, хустку. 16. Шарападобная маса пылу, дыму. 17. Хімічны элемент, газ. 18. Выдзяленне чаго-небудзь каму-небудзь. 19. Тканіна з тонкага валакна або з дабаўленнем такога валакна. 20. Металічны каўпачок, які надзяваецца на палец пры шыцці для засцярогі ад уколу. 21. Пацёртыя часткі сцябла льну або канапель, аддзеленыя ад валакна пры апрацоўцы. 22. Тое, што не дагарэла. 23. Паэма Я. Купалы. 24. Паглыбленне ў сцяне, дзе змяшчаюць мэблю, статуі, вазы. 25. Чалавек, які займаецца вырошчваннем сельскагаспадарчых культур. 27. Невялікая кніжка з мяккай вокладкай і аб'ёмам не больш пяці друкаваных аркушаў. 29. Частка горада, абмежаваная з чатырох бакоў вуліцамі. 31. Асоба, якая выступае на судзе ў абарону каго-небудзь. 33. Пусты цыліндр у машынах, механізмах. 35. Неспакой.

Склала **Ірына БЕКІШ.**

каляндар-2002: студзень

* * *

20 студзеня спаўняецца 80 год з дня нараджэння **Аляксандра КАРПАВА** (памёр у 1998), кінарэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтваў Казахскай ССР. Асноўнае месца ў творчасці рэжысёра займала тэма Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш значная работа — тэлефільм "Доўгія вёрсты вайны". З іншых фільмаў — "Белая зямля", "Заўтра будзе позна" (з рэжысёрам М. Цепаком, разам з Браціслаўскай кінастудыяй, Славакія), "Вясельная ноч", "Асабістыя рахункі".

* * *

30 студзеня 80 гадоў таму назад на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі Народнага камісарыята асветы БССР быў заснаваны **Інстытут беларускай культуры.**

Гэта першая ў гісторыі Беларусі шматгалінавая навукова-даследчая установа (існаваў з 1922 па 1928 год) — папярэднік Акадэміі навук Беларускай ССР. На пачатку дзейнасці асноўная ўвага надавалася распрацоўцы практычных праблем беларускага мовазнаўства, вывучэнню беларускай літаратуры, мастацтва, гісторыі, этнаграфіі. Пастановай ЦВК і СНК БССР ад 13.10.1928 года быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук БССР, урачыстае адкрыццё якой адбылося 1 студзеня 1929 года.

Ларыса КАРАЧУН.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь; Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі; Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма".

Наш адрас: 220005, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 213-31-97 (бухгалтэрыя, тэл.-факс), 213-32-80, 284-76-56, 213-37-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», не заўсёды супадаюць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 068 экз. Зак. 73. Падпісана да друку 14.1.2002 г. у 12.00.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку». (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).